Васіль Быкаў

На крыжах

Выступленні, артыкулы, інтэрв'ю

Мінск
«Беларусь»
1992

ББК 84 Бел 7 Б 95

Серыя заснавана ў 1991 годзе

Быкаў В. У.

На крыжах: Выступленні, артыкулы, інтэрв'ю. — Мн.: Беларусь, 1992. — 271 с. — (Сер. «Плошча Свабоды»),

ISBN 5-338-00981-1.

У кнізе публіцыстыкі народнага пісьменніка Беларусі сабраны выступленні, артыкулы, інтэрв'ю часоў перабудовы. Некаторыя матэрыялы друкуюцца ўпершыню. У іх — роздум пра мінулае і пра сённяшні дзень роднага краю, пра балючыя праблемы, якія ставіць жыццё перад грамадствам і чалавекам.

Для шырокага кола чытачоў.

ISBN 5-338-00981-1

©В. У. Быкаў, 1992

ВЫСТУПЛЕННЕ НА V З'ЕЗДЗЕ СП БССР

Чэрвень 1966 г.

Можна шмат гаварыць пра поспехі беларускай літаратуры ў духу некаторых учарашніх дакладчыкаў, але мне здаецца, што наш з'езд Саюза пісьменнікаў усё ж не юбілейны, і таму лепей гаварыць пра іншае.

Шкада, але я не магу пагадзіцца з выказаным тут аптымізмам адносна выдатных дасягненняў нашай літаратуры. Усім вядома, як крытыкавалася літаратура на XXIII з'ездзе партыі. Два гады запар камітэт па прэміях не прысуджае прэміі ў галіне літаратуры. Літаратура не толькі траціць павагу да сябе з боку кіраўніцтва, але і губляе сілу ў барацьбе за чытача, якога сотнямі тысяч адбіраюць у нас стадыёны ў якасці нечуванай, я б сказаў ганебнай, для цывілізацыі з'явы — арміі агалцелых балельшчыкаў. Не ведаю, як каго, мяне, ж гэтыя факты наводзяць на сумныя развагі. І сапраўды, як гэта атрымалася, што наша літаратура, якая заўжды ўражвала чалавецтва геніяльнасцю сваіх твораў, дажылася да таго, што за два гады не знаходзіцца кнігі, якую можна было б адзначыць Дзяржаўнай прэміяй? У чым справа? У чым справа таксама, што нашы нацыянальныя прэміі, мякка кажучы, зусім не ў пашане, і то прысуджаюцца, то пра іх нібыта «забываюць, і месяцы не чуваць, што вылучана і калі будзе прысуджэнне.

Па ўсім відаць, нашая літаратура перажывае крызіс. І гэта, можа, каму-небудзь падасца дзіўным: столькі пра яе гавораць, праяўляецца такі клопат. Чаму ж тое дзіця такое хілае?

Мне здаецца, што прычыны таго заняпаду ляжаць якраз там, дзе планаваліся поспехі. Адбылася вельмі простая з'ява: у адносінах да літаратуры дзесьці згублена мера, ёю закіравалі, яе заняньчылі.

Калі ў гаспадарцы валюнтарызм неяк асуджаны, дык у літаратуры ён дагэтуль у пышным росквіце. У народнай гаспадарцы ўжо не так камандуюць, як у літаратуры. Вытворчыя адносіны там намагаюць ладзіць з некаторай натуральнасцю і заканамернасцю. Літаратура ж застаецца тым, чым была сельская гаспадарка ў нядаўнім мінулым, — кожны мае да яе адносіны і пры выпадку не супроць патаптаць яе і без таго не надта ўрадлівы агарод.

Але вельмі і вельмі памыляюцца тыя, хто лічыць, што ў мастацтве і літаратуры няма няўмольных законаў, што іх можна папіхаць, як захочацца. На жаль ці на шчасце, такія законы ёсць.

Галоўная цяжкасць для мастака заключаецца ў тым, што законы мастацтва нярэдка не супадаюць з дзеючымі на кожным этапе законамі грамадскага жыцця. Больш таго, яны амаль заўсёды ў супроцьстаянні. У жыцці ідэальнае грамадства тое, дзе як мага меней канфліктаў, а ў мастацтве наадварот. Для жыцця найлепей характары роўныя і празрыстыя, а для мастацтва — складаныя і супярэчлівыя. Мастак у творы або раздвойваецца паміж гэтымі рознаскіраванымі мэтамі, або схіляецца ў нейкі адзін бок. Вось чаму нават для самага вопытнага празаіка пісаць кожную новую кнігу — значыць пачынаць усё спачатку. Увесь яго ранейшы вопыт траціць сваё значэнне, ён заўжды бездапаможны, калі новы жыццёвы матэрыял увасабляецца ў пэўныя мастацкія формы. Прытым немагчыма падпарадкаваць законы мастацтва законам жыцця, таксама як і наадварот. Патрэбна гармонія, мера, тое, што прынята называць мастацтвам і што вызначаецца толькі талентам мастака. Ажыццяўляць дыктат у гэтай справе абсалютна немагчыма без таго, каб не задушыць мастацтва.

Але ці ўсе ў нас разумеюць гэтую даволі банальную ісціну? Баюся, што далёка не ўсе. У жыцці на кожным кроку мы сустракаем горкае неразуменне літаратуры, неразуменне, якое выклікае сум і роспач, асабліва калі вядомыя ідэалагічныя рупліўцы пачынаюць рабіць паспешлівыя палітычныя вывады.

Дзіўна, што ў наш час, на 49-ым годзе Савецкай улады, ў адносінах да літаратуры грэбуюць тым, што некаторым трэба б засвоіць яшчэ ў школьным дзяцінстве. І я перакананы, што высокія аўтарытэты, ідэйныя абгрунтаванні, хоць бы і спасылкі на вайну ў В'етнаме, тут абсалютна не маюць рацыі. Усе беды тут — ад непісьменнасці, нізкай эстэтычнай культуры, а то і дыпламаванага абскурантызму тых, хто прыстаўлены кіраваць літаратурай.

Першай і галоўнай праявай таго абскурантызму, на мой погляд, з'яўляюцца адносіны да адмоўнага ў літаратуры. Яшчэ вялікі Бялінскі ў сваім артыкуле «Ответ «Московитянину» пісаў: «Творчество по своей сущности требует безусловной свободы в выборе не только от критиков, но и от самого художника. Ни ему никто не вправе задавать сюжеты, ни он сам не вправе направлять себя в этом отношении. Он может иметь определенное направление, но оно у него только тогда может быть истинно, когда без усилия, свободно сходится с его талантом, его натурой, инстинктами и стремлением. Он изобразил вам порок, разврат, пошлость: судите, верно ли, хорошо ли это сделал, а не толкуйте, зачем он сделал это, а не другое, или вместе с этим не сделал и другого. Говорят: что это за направление —

изображать одно низкое и пошлое! А почему бы и не так?" — пытаецца Вісарыён Бялінскі і ў іншым месцы гэтага артыкула адказвае: «Это — не один дар выставлять ярко пошлость жизни, а еще более — дар выставлять явления жизни во всей полноте их реальности и их истинности.»

Так, мастацтва — не адвольны твор мастака, але і не планавы прадукт грамадства, яно — душа гэтага грамадства. Нельга дастаць і як сабе хочаш перарабіць тую душу без таго, каб не перайначыць характар грамадства. Абое яны існуюць у адзіным узаемазалежным цэлым.

Літаратуры даводзіцца цяжка, асабліва калі мець на ўвазе не гэтак тэарэтычныя высновы, як яе жыццёвую практыку. У наш час зусім нярэдкія з'явы, калі нават выдатныя тэарэтычныя пастулаты на справе ператвараюцца ў штосьці, што найболей нагадвае свайго роду неакласіцызм. Пра тое не прынята гаварыць, але не сакрэт, што ў літаратуры час ад часу запаноўваюць характэрныя адзнакі менавіта такога літаратурнага напрамку: калі губляецца рэалістычны характар рэчаіснасці, грэбуюць жыццёвай праўдай, рэальнае выцясняецца яўна ідэальным. Я ахвотна пагаджуся, што мастацтва так званага сацрэалізму не дапускае ў сабе безідэйнасць, бяскласавасць, абстрактны гуманізм і гэтак далей. Але бясспрэчна, што і іхнія супрацьлегласці, узведзеныя ў катэгарычны абсалют, — не меншае зло, хіба што з іншым, адваротным знакам. Менавіта гэтае зло нанесла немалую шкоду нашаму мастацтву. І гэта зразумела, калі мець на ўвазе знакамітыя словы У. Леніна, які ў сваёй працы «Детская болезнь «левизны» в коммунизме» пісаў, што «самое верное средство дискредитировать новую политическую (да и не только политическую) идею и повредить ей состоит в том, чтобы во имя защиты ее довести ее до абсурда».

Хіба не зразумела, што голы рацыяналізм, імкненне падпарадкаваць літаратуру ды мастацтва патрэбам кожнага сёння, таксама як загадзя распланаванага заўтра, ігнараванне жыццёвых складанасцяў, дыялектыкі развіцця наносяць непапраўную шкоду не толькі літаратуры, але і ўсяму грамадству.

Мастацтва — гаючы дождж грамадства, якое без яго крытычнага ўздзеяння непазбежна пакрываецца плесенню і загнівае. Апалагетыка без разбору, бяздумнае сцвярджэнне ўсяго існага — па сутнасці не што іншае, як магільшчык грамадства, і вельмі шкада, што мы дасюль не зразумелі ўсёй небяспекі тае з'явы. Вельмі шкада, што і сёння шмат хто кіруецца думкай, нібы людзі, што бачаць заганы ў жыцці, тым больш адважваюцца крытыкаваць яго, заражаны духам

буржуазнай ідэалогіі, паклёпнікі або нават ідэалагічныя дыверсанты. Няўжо ёсць патрэба даказваць, што такая думка па меншай меры неразумная, што праўда, якой бы непрыемнай яна ні была, калі яна сумленна выказана, не можа пашкодзіць дабру, што сапраўдныя, а не прыдуманыя ворагі ўсіх часоў выдатна маскіруюцца самай артадаксальнай фразеалогіяй, выконваюць ролю самых верных служак. Хіба трэба пераконваць, што ўсе ўрадавыя перавароты, усе ўдары ў спіну, усе змовы і здрады рабіліся людзьмі прыбліжанымі, заўжды вельмі лаяльнымі.

Безумоўна, каб пісаць праўду, апроч таленту, патрэбна немалая мужнасць. Але не меней мужнасці патрэбна і для таго, каб успрыняць праўду ва ўсёй яе паўнаце і складанасці. І ў гэтым сэнсе варта выказаць жаль, што некаторыя нашы кіраўнікі, тыя, каму больш за іншых павінна быць уласціва гэтая якасць, апынаюцца, мякка кажучы, не на вышыні. На словах прызнаючы крытыку за рухаючую сілу грамадства, яны тым не менш імкнуцца надаць гэтай крытыцы толькі адзін кірунак — зверху ўніз. Але для літаратуры не існуе ні верху ні нізу. З'яўляючыся чалавеказнаўствам, яна з аднолькавым правам даследуе і даярку, і міністра, радавога члена партыі і сакратара ЦК.

Вядома, што, як і кожная манаполія, манаполія на крытыку — прыемная рэч для таго, каму яна належыць. Няма патрэбы гаварыць, якая «карысць» з яе ў іншых сферах грамадскага жыцця, але для літаратуры яна — згуба. Літаратура без крытычнага пачатку — забава для гультаёў, абывацельская цацанка. Хіба мала ўрокаў такога парадку дала нам сумнай памяці тэорыя і практыка бесканфліктнасці? Папрок жа ў адрас літаратуры за так званае ачарніцельства ці паклёп — з'ява банальная па сваёй распаўсюджанасці, супраць яго ва ўсе часы змагалася літаратура. На гэты конт я зноў дазволю сабе звярнуцца да аўтарытэту Бялінскага. «Самое сильное и тяжелое обвинение, которым писатели риторической школы думают окончательно уничтожить Гоголя, состоит в том, что лица, которых он обыкновенно выводит в своих сочинениях, оскорбляют общество... Подобное обвинение больше всего показывает незрелость нашего общественного образования. В странах, упредивших нас развитием целых веков, и понятия не имеют о возможности подобного обвинения. Никто не скажет, чтобы англичане не были ревнивы к своей национальной чести: напротив, едва ли есть другой народ, в котором национальный эгоизм доходил бы до таких крайностей, как у англичан. И между тем они любят своего Гогарта, который изображал только пороки, разврат, злоупотребления и пошлость английского общества его времени. И ни

один англичанин не скажет, что Гогарт оклеветал Англию, что он не видел и не признавал в ней ничего человеческого, благородного, возвышенного и прекрасного. Англичане понимают, что талант имеет полное и святое право быть односторонним и что он может быть великим в своей односторонности. С другой стороны, они так глубоко чувствуют и сознают свое национальное величие, что нисколько не боятся, что ему могло повредить обнародование недостатков и темных сторон английского общества. Но и мы можем жаловаться только на незрелость общественного образования, а не на отсутствие в нашем обществе чувства своего национального достоинства... Чем сильнее человек, чем выше он нравственно, тем смелее он смотрит на свои слабые стороны и недостатки. Еще больше можно сказать это о народах, которые живут не человеческий век, а целые века. Народ слабый, ничтожный или состарившийся, изживший всю свою жизнь до невозможности идти вперед, любит только хвалить себя и больше всего боится взглянуть на свои раны: он знает, что они смертельны, что его действительность не представляет ему ничего отрадного и что только в обмане самого себя может он находить те ложные утешения, до которых так падки слабые и дряхлые. Таковы, например, китайцы или персияне, послушать их, так лучше их нет народа в мире, и все другие народы перед ними — ослы и негодяи.» Далей ён піша: «Не таков должен быть народ великий, полный сил и жизни, сознания своих недостатков, вместо того, чтобы приводить его в отчаяние и повергать в сомнение в своих силах, дает ему новые силы, окрыляет его на новую деятельность», і далей: «Писатель выведет в повести пьяницу, а читатель скажет: можно ли так позорить Россию? Будто в ней все одни пьяницы? Положим, что читатель умный, даже очень умный человек, да следствие-то, которое он вывел из повести,— нелепо. Нам скажут, что искусство обобщает частные явления и что оно уже не искусство, если представляет явления случайные. Правда, но ведь общество, и особливо народ, заключает в себе множество сторон, которые не только повесть, целая литература не исчерпает».

Прашу прабачэння за даўгую цытату, але мне здаецца, што сказанае Няіставым Вісарыёнам мае самыя непасрэдныя адносіны не толькі да Гогаля, але і да нашай сучаснай літаратурнай практыкі. Калі б нашы выдаўцы і крытыкі часцей чыталі Бялінскага ды лічыліся з яго аўтарытэтам, можа б, яны зразумелі ўсю недарэчнасць шмат якіх уласных прэтэнзій да літаратуры, якія болей за сто гадоў таму разбіў вялікі крытык-дэмакрат. Гэта ж праўда, што з 1847 года, калі былі напісаны гэтыя словы, у нашай літаратуры не шмат змянілася, паранейшаму ў яе адрас усё тыя ж папрокі. Варта напісаць не надта

прывабнага генерала, як адразу ж раздаюцца абвінавачванні ў падрыве прэстыжу савецкіх палкаводцаў; варта намаляваць адмоўны персанаж чыгуначніка, як ужо пішуць пра паклёп на слаўных савецкіх чыгуначнікаў. Абскурантызм з поваду знявагі гонару мундзіра ў апошні час набыў пагрозлівы характар. Я мог бы прывесці красамоўныя прыклады з уласнай практыкі, з жыцця ўсім нам вядомага Аляксея Карпюка, які за наіўную спробу напісаць праўдзівую літаратурную аўтабіяграфію свайго, я б сказаў гераічнага, жыцця паплаціўся ўжо шмат чым і, мабыць, паплаціцца яшчэ.

У кожнай прафесіі важнейшае значэнне мае думка спецыяліста, майстра пэўнага рамяства, але не ў літаратуры. У адносінах да літаратуры здарылася так, што ісціна вызначаецца па прынцыпу субардынацыі. Як кажуць, чым вышэй пасада, тым бліжэй да бога. У канцы пятага дзесятка гадоў Савецкай улады мы марым аб тым жа, пра што ў свой час клапаціўся Луначарскі, які яшчэ у 1931 годзе казаў, што «вопрос надо ставить не так, чтобы Центральный Комитет писал лозунги, а писатели подыскивали иллюстрации к ним, а так, чтобы партия, Центральный Комитет среди других информационных материалов читали и писателей и получали от них импульсы для своих постановлений и лозунгов».

Напісаць добры твор нялёгка ва ўсіх адносінах, але яшчэ цяжэй яго надрукаваць. Гэта ж факт, што ў нас лёгка друкуюцца толькі пасрэдныя творы, тыя, у якіх нічога няма, якія падобны на сотні папярэдніх, ужо выпрабаваных выдаўцамі і крытыкай. А тое, што не адпавядае афіцыйным устаноўкам, сустракаецца з недаверам і пераадольвае магутнае супраціўленне ва ўсіх сферах. Практычна аўтар апынаецца перад дылемай: або прыняць патрабаванні выдавецтва і спаскудзіць твор, або той ніколі не пабачыць свету. Нярэдка ў выдадзеным творы дужа няшмат застаецца ад аўтара і ягонай канцэпцыі. Дзіўны і незразумелы гэты ўзаконены недавер да таленту, недавер, які абразлівы сам па сабе для кожнага літаратара і прыніжае літаратуру.

І тым не менш мы мусім пісаць. Мы стаім на парозе вялікіх падзей нашай гісторыі. У нас ёсць пра што пісаць і ніколі не было недахопу талентаў. Літаратура пачалася не ўчора і скончыцца не заўтра. Беларуская літаратура — не толькі тое, што выдадзена ў ведамстве Захара Пятровіча. Дзённікі і нататкі Даўжэнкі, Нікалаевай, Кузьмы Чорнага, шматпакутныя творы Гарэцкага, рукапісныя творы ўсіх часоў і народаў — не менш літаратура, чым шматтомныя шэрагі ў лідэрынавых вокладках. І мне здаецца, што трэба пісаць не толькі пра жыццё народа, але і пра жыццё літаратуры. Варта памятаць, што

Лукаш Бэндэ ўвайшоў у нашу культуру гэтак жа назаўжды, як і тыя пакутнікі, якіх ён загубіў. Трэба часцей напамінаць пра той горкі вопыт нашай культуры. Асабліва для тых, хто ўсё яшчэ не страціў ахвоту ў падкутых ботах пагойсаць на яе здратаваным агародзе.

Магчыма, гэтыя словы не ўсім спадабаюцца. Можа, замест іх камусьці хацелася б пачуць ад мяне пакаянне ў духу Го Мо Жо. Але ў наш час такія пакаянні, як гэта красамоўна засведчыў А. Макаёнак, не шмат чаго варты. Таму не будзем крывіць душой. Мы не ворагі народа і не падрывацелі асноў Савецкай улады, адданасць якой у свой час засведчылі ўласнай крывёй. Да таго ж мы не патрабуем незвычайнага, мы толькі просім болей цярпімасці. Пастаўце сябе на нашае месца, і вы зразумееце, што выбар у нас невялікі: або літаратура, або нелітаратура. Сярэдзіны — няма.

У заключэнне хачу адзначыць, што, нягледзячы на шмат якія невясёлыя выказаныя тут думкі, я веру ў стваральную сілу літаратуры і ў дабразычлівасць тых, хто пастаўлены ёю кіраваць. Яшчэ хачу падзякаваць шмат якім пісьменнікам, што праявілі ўласную мужнасць і пісьменніцкую салідарнасць з поваду вядомага выпаду ў мой адрас. Покуль мы будзем з'яднаны па важнейшых пытаннях нашага жыцця і будзем гаварыць пра тое адкрыта, беларускі народ можа спадзявацца на добры лёс сваёй літаратуры.

ВЫСТУПЛЕННЕ НА ВЕЧАРЫ РЫГОРА БАРАДУЛІНА

Люты 1985 г.

Барадулін — гэта чараўнік.

Найперш — чараўнік паэтычнай стыхіі, якая жыве ў ім, мабыць, з дня яго нараджэння і які сам жыве ў ёй, вольна і радасна, як жыве птушка ў палёце, рыба ў вадзе, самаадданая жанчына ў каханні. Паэзія для Барадуліна — не варштат, не тачка, не прафесія ўрэшце. Паэзія для яго — бажэсцвенная стыхія, у якой ён нявольнік і ўладар адначасна. Віртуоз і маэстра! Вобразы ягонай паэзіі, гнуткія і хлёсткія, нечаканыя і ўтончаныя, — грацыёзныя служкі яго бязмежнай фантазіі і яго думкі — афарыстычнай і парадаксальнай, мужнай і чалавечнай.

Барадулін — дзіця народнай стыхіі, ён увасабляе яе без знарочыстасці і натугі — проста, натуральна і лёгка, бо тая яго народнасць — сапраўды ад народа, з якога ён выйшаў і якім жыве. Увесь барадулінскі розум — ад глыбіннага сялянскага рацыё, ажыўленага і аздобленага шчырым, трапяткім, чыста барадулінскім эмоцыё. У

ягонай народнасці — спрадвечна сялянскае, амаль язычніцкае адчуванне прыроды, уласнага кутка і жытла, мілай несамавітай Ушаччыны, сардэчныя гімны якой, не перастаючы, гучаць у ягонай паэзіі.

Для каго паэзія!— гэта космас і гмахі, веліч і гучнасць, для Барадуліна ж гэта найперш першазданная існасць: лес, поле, залева, прыпар, золак, дасвецце. Але таксама і драма жыцця і смерці, вайна, чалавек, каханне. Ягоныя вершы поўняцца пошумам дрэў, травянымі пахамі, сельскімі радасцямі. Часам аздоблены сялянскім досціпам, а то і папулерным вясковым слоўцам, у якім не столькі ад злосці, колькі ад мілай бяскрыўднасці.

Барадулін — чараўнік народнага слова.

Пэўна, як ні ў каш іншага з ягоных сучаснікаў паэтычнае слова ў Барадулін» зіхаціць і пераліваецца ўсімі колерамі, гучыць, як бубен, і спявае, бы скрыпка. І ўсё з такім спрытам і густам, на якія толькі і здольна сапраўды паэтычнае слова. Нават самыя непаслухмяныя, каструбаватыя словы нашае мовы, усе гэтыя празаізмы, дыялектызмы, варварызмы і няўклюдныя неалагізмы, трапіўшы ў барадулінскі радок, дзівосна пераўтвараюцца, робяцца надзіва зграбныя і гнуткія. Ці трэба казаць, як гэта важна цяпер, калі сім-тым з дзяцей Беларусі роднае слова ўжо замінае ў іх «вышэйшай» культурнасці ў імпартных джынсах з японскімі «магамі».

У Барадуліна роднае слова гучыць так натуральна і мілагучна, як спрадвеку гучаць у сусветнай паэзіі італьянскае, французскае, расейскае словы. Бо яно, гэтае слова, набывае мілосці і пекнаты з самых глыбіняў закаханага ў яго майстра, сапраўды народнага паэта Беларусі.

Пра паэзію Барадуліна і яго самога можна гаварыць бясконца, ды ўсё роўна сказанае не вычарпае ягонай сутнасці. Барадулін як чалавек і паэт невычэрпны. Бо ён арганічна таленавіты. І яшчэ ён зменлівы. Зменлівы, як кожная жывая істота, як талент, які бярэ ад жыцця на шматпакутнай святой зямлі пад сонцам любае Бацькаўшчыны.

І гэта выдатна. Толькі жывы талент здольны нарадзіць жывую паэзію, якая ў сваю чаргу жывіць культуру, народную самасвядомасць. Паэзія Барадуліна напэўна ж будзе з таго нешматлікага, што, наспатолеўшы духоўную прагу часу, пяройдзе парог стагоддзяў.

Пяройдзе нашаю класікай.

Таму што Барадулін ужо і цяпер, пры жыцці, выдатны наш класік, гонар беларускай культуры, і хоць аб тым пакуль не напісана ў падручніках, не абвешчана з літаратурных кафедраў, гэта так. (Зрэшты, Пушкіна таксама не песцілі ні імператар, ні ягонае міністэрства асветы, затое яго прыняла літаратурная вечнасць.)

ВЫСТУПЛЕННЕ НА ПЛЕНУМЕ СП БССР

Чэрвень 1985 г.

Падзеі такога роду, як наш юбілейны пленум, адметны пэўнаю дадатнай якасцю — яны даюць магчымасць зазірнуць у мінулае, агледзець свой шлях, каб нешта ў ім зразумець. Звычайна, у наш вельмі дзелавы, прагматычны і хуткаплынны век гэта зрабіць няпроста, людзі занятыя важнымі справамі, і для таго, каб азірнуцца на сябе і сваё мінулае, у сучаснага чалавека проста не хапае часу. А можа, і вялікага жадання таксама.

А між тым памяць — гэта матэрыяльная сіла, галоўны элемент чалавечай духоўнасці, яна не толькі здольна ўзнаўляць мінулае, але і вызначаць будучае. І ў катастрафічныя моманты гісторыі ворагі-заваёўнікі ў адносінах да народа-ахвяры перш за ўсё спрабавалі пазбавіць яго гістарычнай памяці, пасля чаго з ім можна было зрабіць, што хочаш. Многія народы выстаялі ў сваім гістарычным існаванні (нягледзячы на тое, што былі напалову фізічна знішчаны ці на стагоддзі пастаўлены на калені) менавіта з дапамогай пісьменнасці і мастацтва, у якіх увасобілася памяць аб мінулым, што з цягам часу дала ім магчымасць узрадзіцца. Успомніце гісторыю балгар. У той жа час адсутнасць пісьменнасці, гістарычнае бяспамяцтва зводзілі ў нябыт нават магутныя плямёны і народы, пра якіх мы і ў XX стагоддзі мала што знаем. Як пра нашых суседзяў яцвягаў, напрыклад.

Так, мы маем развітое мастацтва, высокамастацкую літаратуру, якія надзейна асэнсоўваюць і захоўваюць для нашчадкаў духоўную сутнасць нашай культуры, узбагачаюць народную самасвядомасць. І ў іх, вядома, адно з самых шаноўных месцаў належыць тэме мінулай вайны з нямецкім фашызмам, у якой мы панеслі небывалыя ў гісторыі страты, але і здабылі таксама найвялікшую ў гісторыі перамогу.

Далося гэта, як вядома, няпроста і патрабавала неверагодных намаганняў. Мы цяпер хораша гаворым пра непахісную ўпэўненасць у нашу перамогу, якая нас ніколі не пакідала. Што датычыць гэтай упэўненасці ў гістарычным плане, дык гэта, мабыць, і так. Але ўся справа ў тым, што гісторыя творыцца грамадствам, а грамадства ў сваю чаргу складаецца з індывідаў, існаванне якіх на зямлі, на жаль, не суладна з гістарычнымі маштабамі; чалавек так ці інакш жыве свой вельмі кароценькі адрэзак часу, і многія з нашых людзей так і не дачакаліся перамогі. Ішла вайна, і яны загінулі па шляху да яе. Адны ўлетку 41-га, другія вясной 45-га. І я не ведаю, чыя смерць была шчаслівейшай — тых, пасля якой наперадзе была яшчэ ўся доўгая

вайна, ці тых, хто да яе канца не дабег на некалькі тыдняў, дзён ці нават гадзін. І такіх было ў нас болей як 20 мільёнаў. Ці можа наша мастацтва спакойна ўспрымаць гэты гістарычны факт?

У друку, літаратуры ды і размовах нярэдка можна пачуць залішне катэгарычныя меркаванні аб тым, што важней для грамадства, для гісторыі і для мастацтва — наш гаротны шлях адступлення ад Брэста да Волгі ці наадварот — пераможнае шэсце ад Валгаграда да Эльбы. Мне думаецца, што такая пастаноўка пытання негрунтоўная як сваёй катэгарычнасцю, так і пэўнай наіўнасцю. Ужо так заведзена на зямлі, што гісторыя кожнага народа найбольш памятлівая на перамогу ўласнага войска, і гэта зразумела. Але ўсё ж такі мастацтва імкнецца спасцігнуць ісціну, усю праўду пра чалавека, і таму няцяжка зразумець, што ў мінулай вайне для мастацтва аднолькава важны абодва яе этапы — як гаротны шлях на ўсход, так і пераможнае шэсце на захад. Таксама, дарэчы, як і нашыя зусім удалыя аперацыі на франтах, якіх было нямала, так і аперацыі не зусім удалыя, якіх таксама было не меней за цалкам удалыя. Як героі, што сваім умельствам і адвагай набліжалі нашу перамогу, так і тыя з нашых суайчыннікаў, што так ці інакш памагалі не нам. Як светлыя і самаадданыя парывы чалавечай душы, чым па праву ганарыцца нацыя і грамадства, так і пачуцці іншага парадку: трудна падуладнае чалавеку адчуванне страху, нерашучасці або проста фізічнай нямогласці, што стрымлівалі ягоную самаадданасць. Чалавек — істота сацыяльная, гэта даўно вядома, залежная ад многіх знешніх уплываў, але яшчэ і біялагічная, з устойлівай геннай асновай, пэўным чынам запраграмаванай у дагістарычным мінулым. І тое — не віна чалавека і не ягоная вартасць, тое — яго асаблівасць, з якой ён не можа не лічыцца нават у век небывалага росквіту навукі і тэхнікі.

Мастацтву падуладны ўсе бакі чалавечага існавання, і ў тым яго сіла. Але гэтая яго сіла — не нейкая вольная стыхія — у рэалістычным мастацтве яна мае свае вельмі канкрэтныя рысы і выдатна рэгулюецца вялікім крытэрыем — Праўдай жыцця. Праўда жыцця, абставін і паводзін чалавека ў пэўных жыццёвых акалічнасцях — вось магутны крытэрый нашага рэалістычнага мастацтва.

Калі гэта так у адносінах да чалавечага існавання наогул, дык ці трэба многа даказваць, як гэта важна ў дачыненні да такой экстрэмальнай з'явы, якой з'яўляецца вайна. І з усіх войнаў — наша вялікая вайна з нямецкім фашызмам. Якая тут патрэбна дакладнасць, выверанасць агульнага і праўдзівасць прыватнага.

На жаль, трэба прызнаць, што ў некаторых сучасных творах літаратуры і асабліва кіно пра вайну гэтыя крытэрыі гранічнай

праўдзівасці нярэдка страчваюцца і тым самым вольна ці не размываецца праўдзівая памяць народа аб самым цяжкім і велічным перыядзе яго існавання. Асабліва тут прыкра тое, што гэтая размытасць ідзе галоўным чынам па лініі эмоцый і псіхалогіі — самага тонкага і самага адчувальнага элемента рэалістычнага мастацтва. Некаторым, можа, здаецца, што гэта якраз і неістотна, былі б захаваны знешнія дэталі і рэаліі таго часу, а псіхалогія гэта эфемерыя, і чым яна прасцей — тым лепш. Але яшчэ ад Талстога мы ведаем, што «можно выдумать что угодно, но нельзя выдумать психологию». Дык вось, у такіх творах найбольш вольна абыходзяцца менавіта з псіхалогіяй, зводзячы яе да прымітыву, да псіхалагічнага знака. Але без праўды псіхалогіі няма мастацтва, ёсць хіба прадукт бяздумнай масавай культуры, што гэтак пашыраецца ў масах спажывецкага грамадства. Але нам у нашым гістарычным мінулым, з нашай вялікаю самаахвярнай вайной, з нашай выдатнейшай класікай, ці нам гожа грэбаваць праўдай жыцця, паглыбленым рэалізмам. Цяпер, ва ўмовах нагнятання новай глабальнай пагрозы для чалавецтва, важна і дорага кожнае слова праўды пра мінулую вайну, слова, сказанае разумна, з талентам і тактам як у адносінах да жывых, так і ў дачыненні да паўшых. Так як гэта робяць лепшыя прадстаўнікі ваеннага мастацтва і літаратуры, старэйшыя, што самі са зброяй у руках змагаліся з фашызмам, трохі маладзейшыя за іх, чыё дзяцінства прайшло ў голадзе і холадзе акупаваных ворагам гарадоў і вёсак, і нават тыя, што нарадзіліся пасля вайны, але атрымалі яе з геннаю спадчынай ад бацькоў і імкнуцца расказаць пра яе калізіі — праўдзіва і без упрашчэнства.

Пакуль чалавецтва будзе ўсведамляць і памятаць, што яно перажыло ў сярэдзіне XX стагоддзя, што страціла і чаго дамаглося — новая вайна немагчыма. Я ў тым упэўнены.

ВЫСТУПЛЕННЕ НА ПЛЕНУМЕ СП БССР

Лістапад 1985 г.

Мы жывём у час трывог ад страшэннай пагрозы вайны на знішчэнне, час — рысу, якая падзяляе існаванне чалавецтва на ДА- і ПАСЛЯатамную эпоху і тоіць у сабе пытанне: ці наступіць наогул гэтая пасля-эпоха? Менавіта такі клопат-трывога нязбыўна жыве ў душах людзей, свядомасці цэлых народаў і накладвае незвычайны па ступені адказнасці абавязак на нас, працаўнікоў культуры.

Але культура можа нармальна развівацца толькі ва ўмовах міру, бо яна — прадукт цярпімасці, суіснавання і адначасна фермент высокай чалавечай духоўнасці, якая толькі і можа цяпер супрацьстаяць усяленскаму ядзернаму шаленству. Яна — тое, што тонкай, але надта жывой і неабходнай ніткай злучае ў жыцці мінулае з будучым. Здаўна вядома, што сувязь часоў — не абстрактнае паняцце, гэта катэгарычная прадумана міру і паступальнага развіцця грамадства, і гора таму грамадству, дзе гэтая сувязь ірвецца. Утвараецца пустка, якую, як вядома, не трывае прырода; духоўная ж пустка не толькі спыняе развіццё нацыі,— яна адкідвае яго да нуля. І тады зноў патрэбны стагоддзі высілкаў, подзвігаў апосталаў духу, каб вярнуць нацыю і грамадства ў іх гістарычны рад. Прыкладаў такога роду безліч у гісторыі, мы мелі магчымасць назіраць іх на працягу нашага жыцця — у Азіі, Еўропе, у Лацінскай Амерыцы.

Так, сёння мы з'яўляемся сведкамі развітой эканомікі нашай рэспублікі, сельскай гаспадаркі, з'яўляемся ўдзельнікамі пэўнага развіцця нацыянальнай культуры. Мы маем права ганарыцца дасягнутым, але дух часу, задачы пераўтварэння, якія стаяць перад краінай, нарэшце, рашэнні XXVII з'езда КПСС абавязваюць нас найбольш гаварыць пра нашыя недахопы, якіх у нас таксама нямала.

Я хацеў бы перш за ўсё звярнуць увагу шаноўных калег на тую несумненную ісціну, што нашыя поспехі і няўдачы найперш звязаны з вечнаю праблемай літаратуры, якая хвалявала майстроў слова ўсіх часоў і народаў: для каго пісаць? Хто нас чытае? І калі ў чыста рытарычным плане заўжды ёсць выразны адказ на гэта пытанне, дык часам яго нестае ў свядомасці, у практычных справах пісьменнікаў. Канешне, на тое ёсць шмат прычын: гэта і яўнае зніжэнне ў наш час значнасці друкаванага слова, якое знаходзіцца ў стане жорсткай канкурэнцыі з тэлебачаннем і відэаэлектроннымі сродкамі, гэта і пэўнае звужэнне моўнага нацыянальнага арэалу, і павышаны тэмп жыцця, і славуты паток інфармацыі, ад якога ўжо нікому і нідзе няма паратунку. І тады шмат каму пачынае здавацца, што даволі абстрактнае паняцце «народ» найлепш атоесамляецца з надзвычай канкрэтным паняццем бюракратычных інстанцый — ва ўсёй багацейшай разнастайнасці іх праяўлення. Асабліва яшчэ, калі тыя інстанцыі могуць даволі адчувальна ўшчуваць прыгожае, але і далікатнае пісьменства. І з'яўляюцца творы, яўна разлічаныя на лёгкую «прахадзімасць», на тое, каб хутка дагадзіць тым, ад каго залежыць іхняя ацэнка да друку, у друку і пасля выхаду з друку. Але ў жыцці, на шчасце ці на бяду, шмат што адбываецца не так, як плануецца: чаргуюцца кампаніі, мяняецца начальства і ягоныя густы.

А самае, можа, галоўнае — мяняецца сам час, і творы такога роду канчаюць сваё жыццё ў літаратуры раней, чым паспее выйсці збор твораў іх паважанага аўтара. І гэта зразумела, бо падобныя творы — не што іншае, як прадукт кан'юнктурнага разліку, сезонны тавар шырспажыву, акт ператварэння высокае творчасці ў рамяство. Менавіта ў гэтым мне бачыцца прырода той самай шэрасці, параднасці і алілуйшчыны, якія з нейкага часу сталі пагрозаю для літаратуры і аб якіх нямала гаварылася з трыбуны XXVII партыйнага з'езда. Канешне, гэта не адзіная прычына нашых заган, ёсць і некаторыя іншыя, але гэтая — безумоўны вынік разліку, аглядкі на ласку рэдактара, без меры прывярэдлівага Галоўліта, некаторых кансерватыўных (літаратурных і нелітаратурных) начальнікаў.

Аднак што ж вынікае з дадзенай акалічнасці, які ўрок можа засвоіць з яе літаратура? Мне думаецца, найперш той, што свой кожны радок, кожнае слова і вобраз пісьменнік павінен адрасаваць народу, выказваць ягоныя клопаты і ягоны боль і рабіць гэта з гранічнай праўдзівасцю. Могуць запытацца: а як уведаць пра гэтыя клопаты і гэты народны боль — з народам жа не параішся? На жаль, не параішся, гэта праўда, але тут трэба даверыцца таленту, калі толькі ён ёсць. (Талент, між іншым, тым і адрозніваецца ад няталенту, што выдатна адчувае народны клопат, бо сам ім жыве, а зусім не тым, што ўмее прыгожа апісаць усход сонца ці зіхаценне расы на аксамітнай траве, як нядаўна яшчэ лічылі некаторыя вучоныя кніжнікі.) Яшчэ трэба памятаць, што талент мае права гаварыць народу ўсю праўду пра ягонае існаванне, часам горкую і балючую праўду, якая ёсць у гісторыі кожнага народа. Канешне, няма ніякай гарантыі таго, што аўтара неадкладна засыплюць кветкамі (могуць закідаць і каменнем), але калі ягоная праўда з вялікай літары, дык пройдзе час, і яму той жа народ паставіць прыгожы помнік на самай прыгожай плошчы свайго сталічнага горада. Але гэта пасля, бо пры жыцці «нет пророка в отечестве своем» — ісціна, добра вядомая з часоў першых хрысціян, і кожны з нас, творцаў, павінен памятаць гэта.

Калі гаварыць яшчэ пра нашу беларускую літаратуру, дык мне здаецца, што пры наяўнасці несумненных талентаў і сапраўды значных твораў ёй усё ж моцна шкодзіць пэўны рацыяналізм, галаўны, калі можна так сказаць, падыход да многіх з'яў жыцця і мастацтва. Асабліва прыкра, што гэты недахоп паступова, але няўхільна запаноўвае таксама і ў нашай паэзіі. Мала непасрэднасці светаўспрымання, арганічнасці пачуцця. Сярод вялікае колькасці паэтычных радкоў і зборнікаў апошніх гадоў дужа мала, аднак, водбліскаў той страсці, якая хвалюе свет, грамадства і якая заўжды так ярка

вызначае вершы нашага старэйшага і заўжды маладога Пімена Панчанкі, ці няўрымслівага Генадзя Бураўкіна, ці чараўніка беларускага слова Рыгора Барадуліна, той мудрай шчырасці адчування, якая сціпла і добра жыве ў радках таленавітай Жэні Янішчыц, той нечаканай стыхійнай натуральнасці, што ёсць у вершах маладога Леаніда Галубовіча. Што датычыць прозы, дык, няледзячы на паяўленне цэлага рада сапраўды добрых кніг на тэмы сучаснасці, вайны, публіцыстычных і драматургічных твораў, галоўная кніга накшталт мележаўскай эпапеі яшчэ усё наперадзе. У нашай літаратуры застаецца белая пляма на месцы незабыўнага Уладзіміра Караткевіча, чалавечы лёс да якога, дарэчы, паставіўся так няўдзячна. Але, мабыць, так ужо заведзена на белым свеце, што да сапраўдных апосталаў дабра і справядлівасці лёс заўжды ставіца няўдзячна: перш іх распінае, каб затым узвысіць...

І тут я хачу кінуць папрок маладым, тым, што увайшлі ў літаратуру і ўжо набылі літаратурнае імя, а таксама тым, хто ў яе ўваходзіць. Здаўна было так у нашай літаратуры, што яе аблічча ў значнай меры абнаўлялі маладыя, якія нярэдка, часам, можа, і залішне катэгарычна, адвяргалі пісьменніцкі кансерватызм старэйшых, смела ўрываліся ў трудную сацыяльнасць жыцця, даволі плённа для сябе, а галоўнае для літаратуры ўступалі ў жыццёвыя канфлікты сучаснасці. На жаль, цяпер гэтая справа выглядае інакш: некаторыя нашы маладыя самі дужа лёгка і ахвотна засвойваюць ахраніцельскі кансерватызм, уласцівы старэйшым пакаленням, і калі распачынаюць канфлікты са старэйшымі, дык зусім не на літаратурнай глебе.

Аднак будзем аптымістамі і не пакінем спадзявацца, што, перамогшы шмат што, пераможам і ўласныя заганы. Адмовімся ад разліку, заўжды несумяшчальнага з высокім мастацтвам. Набудзем непасрэднасці і безагляднасці. Запомнім прытым, што сапраўдны талент рэдка разлічвае на міласэрнасць і палёгку, у сваім мастакоўскім лёсе ён мусіць прымаць усё, як належнае. Урэшце час і народ ацэняць па справядлівасці. Жыццё зменлівае, але народ вечны, як вечныя законы чалавечага існавання, над якімі мы не ўладарны. Мы можам хіба імкнуцца спасцігнуць іх логіку і адлюстраваць яе ў мастацкіх вобразах, тым саслужыўшы сваю духоўную службу грамадству, да якога належым, і Радзіме, у якой жывём.

ГАЗЕТА «ЛИТЕРАТУРНА УКРАИНА»

Апрель 1986 г.

Я знаю Ивана Драча почти четверть века — половину всех прожитых им лет, и по возможности читаю все, что выходит из-под пера этого замечательного поэта, мыслителя, одного из самых лучших мастеров слова никогда не скудевшей талантами братней Украины. Когда-то нас познакомил, наилучшим образом представив его, наш общий друг, другой честный и напряженный мыслитель и столь же честный художник слова Алесь Адамович, безукоризненный вкус которого к знакомству и дружбе общеизвестен у нас, в Белоруссии. Высокое мнение Адамовича об его украинском друге вскоре подтвердил незабвенной памяти Микола Платонович Бажан, который в одном конфиденциальном разговоре со мной, когда речь зашла о молодых украинских литераторах, сказал, что Драч — настоящий народный интеллигент, в избытке наделенный всем для того, чтобы стать великим поэтом Украины.

Наверное, это так. Во всяком случае в течение многих лет, за которые в нашем изменчивом мире столь многое изменилось в своем качестве, нередко вынуждая переоценивать недавние авторитеты, как и наше отношение к ним, человеческая и писательская репутация Ивана Драча лишь крепла и утверждалась прежде всего его замечательным творчеством, исполненным передовой современной философии и жизнеутверждающего народного пафоса. Я люблю его стихи, в которых всегда дышит подлинная поэзия, неподдельное человеческое чувство и, что, может быть, важнее всего, — напряженная живая мысль о времени и нашей скоропреходящей жизни. Иван Драч — достойный сын своего народа с его богатой и драматической историей, огромной культурой, что благодатнейшим образом отражается как в его творчестве, так и в его мировоззрении. И это прекрасно, если учесть к тому же, что поэтическое выражение его Я всегда исполнено с предельной человеческой искренностью, без позы и бравады.

Мне хотелось бы сказать еще о безупречном гражданском облике Ивана Драча, о его незамутненном чувстве причастности ко всем радостям и болям времени, когда это чувство выражается не только в его строках, но и не менее того — в его поступках. Приходится лишь завидовать живости его связей с проблемами огромной страны и ее республик — у него всегда достает внимания и сил, чтобы тратить их на многочисленные ближние и дальние поездки и работу — работу ради людей.

Так уж в нашей жизни заведено, что мы не часто встречаемся, а при тех редких встречах, что нам дарит случай, не имеем обыкновения говорить друг другу, может, о самом главном, что живет в сердце, — о нашем дружеском расположении, любви и преклонении перед мужеством и талантом. Чаще всего это лучшее уносим с собой, чтобы тихо пестовать в душе до новой, как правило, нескорой встречи. Пользуясь настоящим, действительно очень подходящим поводом, хочу нарушить эту не самую лучшую мужскую традицию и передать замечательному певцу братской Украины, честному художнику страны, мыслителю и брату выражение моей искренней любви и уважения.

Живи долго, Иване, и пиши много. Мы тебя любим!

ВЫСТУПЛЕННЕ НА СХОДЗЕ, ПРЫСВЕЧАНЫМ 150 УГОДКАМ З ДНЯ СМЕРЦІ А. ПУШКІНА

Студзень 1987 г.

Пушкін — адна з вяршынь сусветнай культуры, нязгасны светач духоўнасці — пражыў недаўгое, складанае жыццё, надзвычай багатае ўрокамі для людзей і для чалавецтва ў цэлым.

Ён належаў да тых волатаў духу, якіх у свой час або шчыра любілі, або гэтак жа шчыра ненавідзелі. У адносінах да яго размежаванне было гранічнае: або — або.

Дзеля справядлівасці трэба зазначыць, што гэтаксама адносіўся да свету, у якім жыў, і сам Пушкін. Адных ён усім сэрцам любіў (сяброў па ліцэю, некаторых разумных дам і немітуслівых літаратараў, проста шчырых, адкрытых людзей), другіх ненавідзеў (пустых царадворцаў, безгаловых чыноўнікаў, цэнзараў, традыцыйна ўсёмагутную ў Расіі тайную паліцыю).

Вядома таксама, што Пушкін недалюбліваў сентыментальныя раманы і велерэчывыя гістарычныя сачыненні. «Ни наших университетов, ни наших театров Пушкин не любил», — сведчыць адзін з яго блізкіх сяброў Павел Воінавіч Нашчокін. Дзіўна, але чалавек высокай культуры, майстра слова, ён не так ужо шанаваў прозу. Ёсць яго асабістае сведчанне, якое ў перадачы ягонай сяброўкі Аляксандры Андрэеўны Фукс гучыць так: «Как жалки те поэты, которые начинают писать прозою; признаюсь, ежели бы я не был вынужден обстоятельствами, я бы для прозы не обмакнул пера в чернила». Калі гэта сапраўды так, дык чалавецтва ўдзячна тым яго «обстоятельствам», якія так ці інакш былі ім перажыты; мы нават удзячны тым

невясёлым абставінам, якія затрымалі паэта на некалькі тыдняў у далёкім Болдзіне і тым садзейнічалі нараджэнню бессмяротных радкоў ягонай прозы — маленькіх аповесцяў і маленькіх трагедый. Цяпер ужо няважна, як да гэтага ставіўся сам аўтар, які, дарэчы, схаваўся тады за прыдуманым іменем Івана Пятровіча Белкіна і нават сачыніў яго псеўдабіяграфію, няважна, што некаторыя з сяброў сустрэлі паяўленне ягонай прозы ў друку без асаблівай радасці, нават малаважна і тое, што разумны і праніклівы Бялінскі назваў іх нявартымі ні таленту, ні імені Пушкіна. Час паказаў, што Пушкін стварыў шэдэўры, значэнне якіх ніколі не зменшыцца.

Пушкін з'явіўся вялікім рэфарматарам літаратуры, усіх яе жанраў. Ён пераўтварыў тагачасную літаратурную мову, паэзію і, канешне ж, не мог абысці сваім наватарствам прозу.

Вядома, што проза — гэта перш за ўсё мова ў яе жывой натуральнасці, не перасаджаная з французскай ці якой-небудзь іншай, не штучны сурагат, а народная і жывая, якой тады не шмат было ў пецярбургскіх салонах, — затое ёю поўнілася народная стыхія, расійская глыбінка. Пушкін быў першы з расійскіх літаратараў, хто не пабаяўся шырока пусціць яе, занядбаную і пагарджаную, у расійскую славеснасць, у сваю паэзію, а затым і ў прозу — ад «Арапа Пятра Вялікага» да несумненнага пушкінскага шэдэўра, знакамітай «Капітанскай дачкі». Ён жа затым і сфармуляваў яе славутае неўміручае крэда: «Точность и краткость — вот первые достоинства прозы. Она требует мыслей и мыслей — без них блестящие выражения ни к чему не служат».

Урокі Пушкіна-празаіка так ці інакш адбіліся на творчасці геніяў сусветнай літаратуры, але найперш рускай. Лермантаў, Гогаль, Талстой, Чэхаў, Бунін тварылі пад несумненным уплывам Пушкіна. Ягонага ўплыву ў гэтым сэнсе не абмінуў ніводзін з сур'ёзных беларускіх пісьменнікаў, асабліва ў ранейшыя дзесяцігоддзі. (Гэта цяпер мы распісаліся, і не столькі думак у нашай прозе, колькі слоў. І тамоў.)

Але Пушкін вялікі не толькі паэтычнымі ці празаічнымі ўрокамі. Усё ягонае жыццё — змястоўнейшы ўрок этыкі, годнасці і маралі. Нават ягоныя чалавечыя слабасці — урок для многіх пакаленняў пісьменнікаў, дзеячаў культуры.

Ён быў волатам духу і заставаўся звычайным чалавекам свайго складанага часу. Ён не любіў царскі двор, але не меў сілы адмовіцца ад пакутніцкага жыцця пры ім. Вядома, што за якіх два гады да сваёй гібелі ён падаў прашэнне аб адстаўцы і нават атрымаў дазвол ад цара, ды забраў тое прашэнне назад. І мы цяпер думаем, як бы,

мусіць, інакш склаўся ягоны лёс, калі б ён выйшаў у адстаўку, паехаў з сям'ёй у сваё Міхайлаўскае... Але не, умяшаліся сябры і з іх самы лепшы — Жукоўскі. Як гэта нярэдка бывае — з самых лепшых пачуццяў і найлепшых жаданняў. Але тое ўмяшанне павяло паэта прамой дарожкай да гібелі.

Вядома, што жыццё і гісторыя багаты на крутыя павароты і нечаканасці, далёка не ўсё ў іх можна прадугледзець нават у наш камп'ютэрызаваны век. Часам не ўсё разумеў і Пушкін. Як сведчаць сучаснікі, ледзь не да апошніх гадоў жыцця ён як бы саромеўся звання літаратара, «сачыніцеля», як тады гаварылі. Ён хацеў быць патомным расійскім дваранінам, належаць да знаці. Ён невысока ставіў Акадэмію славеснасці, да членаў якой належаў, і дбаў пра членства ў Акадэміі навук, куды яго ўпарта не пушчаў сам міністр асветы граф Увараў. Шмат год не хацеў верыць Пушкін у сваю вялікую нацыянальную місію, якая зрабіла бессмяротным яго імя. Але ж хіба адзін Пушкін? І хіба тое здаралася толькі ў часы Пушкіна? Поезд справядлівасці, як даўно вядома, нярэдка спазняецца, і «нету пророка в отечестве своем». У поўным сэнсе вялікім прарокам Пушкін стаў пасля смерці, затое ён будзе такім заўжды. Даўно сцерліся з людской памяці імёны цароў і царадворцаў, розных «сильных мира» пачатку XIX стагоддзя, усіх тых, перад кім пачціва цягнуўся Пушкін. А Пушкін жыве. І ён будзе жыць, пакуль будзе існаваць чалавецтва, бо ягоная вялікая, жывая душа ў наш не толькі жорсткі, але і жудасны век з'ядноўвае людзей пачуццямі дабра, злучае разарваную сувязь часоў і дае надзею.

Надзею выжыць, не ператварыцца ў атамных дзікуноў, не толькі выхаваць сучасны высокарацыянальны розум, але і не занядбаць душу, здольную на дабрыню, чалавечнасць, а часам — і слабасць. Калі-нікалі так бывае ў гісторыі, што апроч сілы патрэбна і слабасць, бо слабасці патрэбна справядлівасць. Сіле ж нічога не трэба.

І гэта выдатна разумеў Пушкін.

Няхай жа навек ён застанецца на зямлі прарокам дабра і справядлівасці.

ГАЗЕТА «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Верасень 1987 г.

Аднойчы, яшчэ даўно, у выпадковай размове адзін вядомы маскоўскі літаратар, прачытаўшы ў часопісе публіцыстычны артыкул Алеся Адамовіча, запытаўся ў мяне пра аўтара і, пачуўшы ў адказ,

што гэта малады беларускі празаік і літаратуравед, здзівіўся: адкуль у таго такое глыбокае разуменне чалавека, такое рашучае непрыняцце фальшы і крывадушна, такое дасканалае веданне часу, літаратуры і яе няпростых заканамернасцяў.

Адкуль? Хто ж яго ведае, але што тое здаўна і ў поўнай меры ўласціва Адамовічу, дык гэта пэўна. Я, напрыклад, не ведаю другога такога літаратара ў Беларусі, хто б так глыбінка і дакладна разумеў свет і прыроду чалавечых заганаў, асабліва ў наш час, калі столькі ўжо выплыла на паверхню і яшчэ больш тоіцца, чакае на сподзе, то даючы надзею, то павяртаючы ў роспач. Чалавецтва ўвачавідкі падышло да свае жахлівай мяжы, калі выратаваць яго ад пагібелі можа толькі катаржна-плённая праца душы, у пакутах народжаная духоўнасць. Шматпакутны лёс нашай зямлі сёння, як ніколі раней, залежыць ад высілкаў кожнага, ад нашай крыштальнай сумленнасці і самаахвярнае безагляднасці. І нам прыемна ўсведамляць, што ў гэтай справе ёсць выдатныя прыклады, адным з якіх з'яўляецца шматгадовая літаратурная і грамадская дзейнасць нашага земляка, выдатнага пісьменніка і мысліцеля Алеся Міхайлавіча Адамовіча.

Так, ён перш за ўсё мысліцель, філосаф сучаснай ядзернай эпохі, які яшчэ задоўга да пачатку перабудовы, у гады так званага застою, не толькі заклікаў іншых, але і сам актыўна і паслядоўна дбаў пра новую свядомасць, якая б паклала асновы мірнага суіснавання народа. Праўда, тады многія ягоныя пастулаты крыкліва адвяргаліся дагматыкамі, іх выкаранялі з ягоных артыкулаў і выступленняў, іх аўтара вусна і пісьмова абвінавачвалі ў... У чым толькі яго не абвінавачвалі! Але, як пісаў нядаўна выдатны літаратурны крытык Ігар Дзядкоў, «шчасце і няшчасце мастака, што некаторыя важныя рэчы ён гаворыць раней за іншых, І не таму, што разумнейшы за некага. Дастаткова, калі мае перавагу ў маральнай паслядоўнасці і сіле спачування». Гэта так. Адамовіч, вядома, пераўзыходзіў многіх як сілай аналітычнага мыслення, так і безумоўнай маральнай непахіснасцю перад няпраўдай. Не зважаючы ні на што, ён праз гады застаецца сабой, і цяпер тыя яго высновы пяці- і дзесяцігадовай даўнасці сталі заканамернымі імператывамі нашай міжнароднай палітыкі і шырока падтрымліваюцца дэмакратычнымі коламі свету.

Талент Адамовіча надзвычай шматгранны. Можна нават сказаць, што гэты чалавек — творца універсальных магчымасцей, які бліскуча засведчыў сябе ў розных жанрах літаратуры. І ўсё ж ён пісьменнік, празаік шырокага жанравага дыяпазону — ад лірычнай аповесці да эпічнага рамана. Яго аналітычна-філасофская проза, найбольш ярка прадстаўленая «Хатынскай аповесцю» і «Карнікамі», бе-

зумоўна, з'яўляецца вяршыняю беларускай і савецкай ваеннай прозы. На многіх старонках гэтых твораў знайшло дзівоснае па гармоніі паяднанне Адамовіча-мастака і Адамовіча-правідца, часам роўнага па сіле таленту Дастаеўскаму. Чытаючы іх, не перастаеш здзіўляцца, якім чынам спасцігнута ўсё гэта, з якіх завулкаў чалавечай душы здабыта? Мусіць, тое ж можна сказаць і пра яго «Апошнюю пастараль» — гэты здзіўляючы літаратурны вопыт сучаснага апакаліпсіса, які можа здасца пачварнай фантастыкай, постядзернай антыутопіяй. Але Адамовічу можна паверыць. Як ніхто з сучасных мастакоў слова ён адчувае надта абвострана маштабы ядзернай пагрозы чалавецтву і як ніхто з сучаснікаў гатовы без аніякага разліку, накшталт рыцара сумнага вобразу, з адным аголена-балючым сумленнем кінуцца супраць пагрозы. Часам тыя, што заўжды стаяць убаку і, канешне ж, адчуваюць сябе разумнейшымі, грэбліва ўсміхаюцца: «Хіба так можна нешта зрабіць? Там жа сцяна!» Але Адамовіч не прывык вагацца ці разлічваць свае шанцы і, здараецца, насуперак логіцы робіць! Ці не сведчанне таго — ягоны безразважны ўдзел у ліквідацыі пагрозы чарнобыльскай катастрофы — учынак, што, як вядома, каштаваў Адамовічу немалых страт, затое дапамог людзям засцерагчыся ад вялікай нечаканай бяды. І цяпер многія і не падазраюць, каму абавязаны жыццём і здароўем. Але, можа, гэта і добра. Адамовіч ужо пэўна не з ліку славалюбівых.

Не славалюбівы — гэта безумоўна. Ужо будучы прызнаным пісьменнікам, вучоным-літаратуразнаўцам, прафесарам універсітэта, ён кінуў усе свае літаратурныя клопаты і разам з Брылём і Калеснікам падаўся ў народ запісваць — не сваё — народнае веданне вайны, ратаваць ад забыцця трагічныя лёсы «хатынскіх вёсак». Некалькі гадоў беспрытульнага блукання па глухіх кутках Беларусі, сотні сустрэч і кіламетры магнітафонных стужак далі нацыянальнай літаратуры унікальны твор, своеасаблівую антыфашысцкую біблію. Менавіта гэтая кніга шчасліва ўсчала новы жанр ваеннай дакументалістыкі, бліскуча прадоўжаны затым «Блакаднай кнігай»(усё таго ж А. Адамовіча і Д. Граніна), усёй творчасцю С. Алексіевіч і іншых.

Але калі не зваблівы покліч славы, дык што ж тады рухае ім, што кіруе ягонаю апантанасцю? Мабыць, гэта, аднак, абвостраная прага справядлівасці, глыбокачалавечая цяга да праўды, да якой спрадвеку так трудна бывае дапяцца. Мусіць, гэта было таксама ў аснове адамовічавага звароту да толькі што адкрытай па тым часе творчасці выдатнага класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага, проза якога намаганнямі Алеся Адамовіча была ўведзена ў літаратурны абарот рэспублікі і краіны. Зрэшты, калі аб тым гаварыць, дык аўта-

рытэт Адамовіча як крытыка-літаратураведа здаўна надзвычай высокі ў савецкай літаратуры. А ў Беларусі тым больш. З канца 50-ых гадоў і да нашага часу, мабыць, ніхто з крытыкаў так плённа і рашуча не ўплываў на нацыянальны літаратурны працэс, як гэта рабіў Адамовіч. Ён жа сваім рупным прыкладам і беззаганнай прынцыповасцю садзейнічаў выхаванню цэлай плеяды выдатных крытычных талентаў, якія цяпер шырока вядомы і па-за межамі рэспублікі. Гэты ягоны ўплыў на літаратуру краіны толькі мацнее з гадамі, бо забяспечаны крэдытам высокай навуковасці і маральнай чысціні ягонай асобы.

В ряде случаев сомнительные методы отношений с «неформалами» успешно переносятся и в сферу давно сложившихся, но не менее порочных отношений с вполне формальными, законными организациями. Так, недавнюю инициативу четырех творческих союзов республики (художников, журналистов, писателей и кинематографистов) и некоторых других по созданию антисталинского общества «Мартиролог Белоруссии», руководство республики поспешило

квалифицировать как незаконную и отказалось признать статус данной организации. Тем самым, по сути, было выражено пренебрежение к политической воле огромной части национальной интеллигенции республики, так и не сумевшей в законном порядке отстоять свое законное демократическое право. Оставленный без последствий антидемократический акт властей, как и следовало ожидать, нашел свое дальнейшее развитие, когда органами милиции был произведен взлом в помещении Союза писателей БССР. Маленький провинциальный «уотергейт», совершенный по-воровски, ночью, без ведома руководства Союза вызвал бурю протестов общественности и также остался без последствий. Огромная армия творческих работников республики оказалась лишенной всякой возможности для реализации своих элементарных гражданских прав. Многократные обращения в правоохранительные органы со стороны как «формалов», так и «неформалов» заканчиваются однотипными ответами вроде того, что прокуратура (района, города, республики) в действиях милиции (МВД, исполкома) противоправных мотивов не усматривает. Впрочем, что прокуратура, если даже коллегия адвокатов Минска на обращения пострадавших с жалобами на власти и милицию отвечает выпадами против самих же пострадавших. Недавно Белорусское телевидение демонстрировало документальный фильм, в котором с достаточной наглядностью нашла свое отражение по меньшей мере странная позиция адвокатов, заявивших в финале, что они найдут способ, чтобы данный фильм никогда не вышел на экраны. Мне думается, что все это — исчерпывающее свидетельство весьма своеобразного понимания смысла гражданских прав и свобод в республике.

Да, многое изменилось в общественно-политической атмосфере нашего общества, что, к сожалению, далеко не все могут или хотят осознать. Беспрецедентная общественно-политическая активность в период избирательной кампании, достигнутая не в последнюю очередь и усилиями «неформалов», начинает заметно спадать. И в этом также сказалась целиком негативная позиция в отношениях к ним партбюрократии, что, понятное дело, трудно согласовать с принципами демократизации и перестройки. Только совместными усилиями всех слоев общества, всех его плюралистических направлений, поддерживающих перестройку, возможно успешное завершение последней. Не в конфронтации, а в консолидации и сотрудничестве наша конструктивная сила, если мы на деле, а не на словах намерены осуществлять задуманное.

ЕЖЕНЕДЕЛЬНИК «МОСКОВСКИЕ НОВОСТИ»

Сентябрь 1989 г.

Эстония, как и вся Прибалтика, переживает трудное время, и ее трудности, на мой взгляд, в значительной степени берут свое начало в нашем не столь отдаленном прошлом, продолжающем существовать и в перестроечное время. Это лишь кажется так, что болезненные национальные проблемы выплеснулись с известными актами о языке — язык здесь только повод, предлог, но далеко не причина. Тем более не самая главная из причин.

Причина, как мне видится, заключена в несколько иной, не менее, а может, и более важной проблеме.

Казалось бы, что предосудительного можно увидеть в том, что озабоченные угрозой размывания национальной культуры, процессом сужения сферы употребления национального языка законодательные органы республики предприняли определенные меры, отвечающие интересам большинства? Как к этому должны отнестись проживающие в республике национальные меньшинства? Нетрудно было бы предугадать развитие сходной ситуации в любом из демократических государств, где давно и без сколько-нибудь заметных конфликтов сосуществуют разнообразное меньшинство и коренное население. У нас же происходит нечто неслыханное: национальные меньшинства в республиках, проявляя известную индифферентность к основной национальной культуре, в определенные моменты делают довольно ощутимые попытки деструктивным образом влиять на ее состояние. И если их позиция, касающаяся собственного языка и культуры, в общем понятна и правомерна, то мотивы их нетерпимости по отношению к коренной культуре республики труднопостижимы. Становится совершенно непонятным их неприятие малейшей попытки коренной национальности укрепить свое языковое состояние доступными средствами и тем оберечь целостность национальной культуры. Чем же вызвано такое неприятие хотя и чуждых, но столь элементарных и естественных национальных мер и мероприятий?

Разве тем, что эти вполне законные меры основной нации задевают интересы и амбиции меньшинства? Покушаются на его многолетнее существование в хотя и не враждебной, но, по-видимому, так и не ставшей близкой этнической среде? Порождают дополнительные заботы в виде потребности изучения незнакомого языка? Нарушают привычную за десятилетия такую благодатную языковую инертность?

Если так, то как же тогда можно назвать все это на общедоступном, лишенном хитроумного философствования языке?

В конце концов можно ведь и не изучать, жить как живется, не замечая и не слыша людей, с землей которых связаны собственная судьба, будущее детей. Кажется, последние законодательные акты в той же Эстонии вполне допускают такую возможность. Но в таком случае не будет ли безнравственной претензия на право управлять этими людьми, руководить их производственной деятельностью, навязывать им собственные вкусы и верования? Не разумнее ли постараться, если не принять, то хотя бы понять их национальные заботы, вытекающие из их национальных особенностей? Даже колонизаторы прошлого (из тех, что поумнее) для успешного управления подданными изучали их язык, основы их национальной культуры. Но ведь с тех пор многое изменилось, и времена имперской идеологии меняются на всей земле. Другие настают времена! Законы народовластия учреждаются на всех континентах, во всех демократических, суверенных государствах, какими номинально являются и наши прибалтийские республики.

Но все дело в том — являются ли? Могут ли их законодательные органы полноправно реализовать политическую волю тех, кого они представляют?

Установление ценза оседлости своей пугающей новизной, похоже, шокировало многих. Стоит, однако, поразмыслить, настолько ли этот ценз неприемлем, как может показаться тем, кто, учась демократии, еще находится в ее подготовительном классе. Ведь на более низком, так сказать, элементарном уровне это «парадоксальное» требование таковым совсем не является. Мы же не удивляемся, когда, скажем, для выборов колхозного председателя непременным условием признаем факт его проживания на территории данного колхоза. И считаем правильным участие в выборах его лишь членов колхоза, а вовсе не жителей всех окрестных хозяйств. Одно из самых порочных порождений административно-приказной системы — чудовищная, нигде в мире, как у нас, так не распространенная легкость, с которой перемещаются различные группы населения, систематическая передвижка руководящих кадров. В биографии любого сколько-нибудь «поруководившего» партийного или советского работника — десятки должностей, мест работы, часто ничего общего не имеющих с предыдущими. Разумеется, все это не лучшим образом сказывается на деле, которое он с такой же легкостью оставляет, как и приступает к новому. То же можно сказать и о рядовых работниках, чьи трудовые книжки пестрят десятками записей, как и паспорта — штампами

прописок-выписок. Стоит лишь бегло ознакомиться с нынешним составом Верховного Совета любой из республик, чтобы убедиться, сколько в нем представителей верхов, центральных ведомств, московского генералитета, по обыкновению являющихся в республику два раза в год, чтобы отметиться, проголосовать за заранее подготовленные решения и уехать. Это депутатство им полагается по их номенклатурной должности, и за свою руководящую жизнь они успевают сменить десятки краев и областей, не имея ни желания, ни возможности вникнуть, вжиться в их истинные заботы. Да и зачем вживаться, когда на следующий срок они будут заседать уже за тысячи километров отсюда. Но ведь чтобы по-настоящему болеть за дело, надо его знать, надо в нем вариться. «Надо жить оседло», — мудро и точно заметил как-то истинный русский интеллигент академик Д. С. Лихачев.

Вот почему ценз оседлости при всей его кажущейся необычности, безусловно, служит интересам народа, является важным средством осуществления народовластия, демократизации общественной жизни. И принятие его — несомненно, разумное демократическое установление, достойное распространения в избирательной системе страны. Наверное, это особенно касается выборов в местные органы власти. Так почему же этот ценз вызывает неприятие известной части граждан республики, которые видят в нем дискриминацию собственных прав и возможностей?

А может, дело здесь вовсе не в тех воображаемых правах, которых они лишаются, а скорее в тех, которые приобретают другие? Недаром же говорит пословица, что не тогда мужик радуется, когда покупает лошадь, — больше радуется, когда лошадь у соседа сдохнет.

Может так статься, что в этом все дело.

Сталинско-брежневское прошлое выработало в нас устойчивый синдром неприятия всего не только и не столько действительно вздорного и враждебного, но также и основанного на здравом смысле, непривычного и нового. Мы боимся, как бы людей с этим новым и необычайным не постигла удача, давно не постигавшая нас, чтобы они не зажили лучше нашего. Особенно если эти люди не совсем такие, как мы, хоть чем-то отличаются от нас — языком, бытом или укладом. Или даже более совершенным и демократическим Законом о выборах.

ЗВАРОТ ДА ВЫБАРШЧЫКАЎ

Красавік 1989 г.

Дарагія выбаршчыкі, шаноўныя грамадзяне Беларусі!

Менш чым праз месяц вы пойдзеце на выбарчыя ўчасткі, каб выбраць тых, каму вы давяраеце прадстаўляць вас у высокіх органах дзяржаўнай улады. Хоць тое будзеце рабіць не першы раз, гэтыя выбары не такія, як усе ранейшыя, гэта сапраўды выбары, і ад іх вынікаў будзе нешта залежаць у вашым жыцці. Можа залежаць больш, калі вы выбераце тых, хто памятае інтарэсы народа і гатовы абараніць іх на любым узроўні. І будзе залежаць мала, калі большасць вашых галасоў будзе аддадзена тым, для каго няма іншых інтарэсаў, апроч інтарэсаў начальства, апарату, кіраўніцтва, ад якіх у іхнім жыцці ўсё — ад павышанай нядаўна зарплаты да чорнае «Волгі» і усялякіх яўных і тайных ільгот. Звычайна гэтыя людзі — шматвопытныя дэмагогі, хуткія на абяцанкі, якімі яны звыкла карыстаюцца на працягу ўсёй сваёй кар'еры. Будзе — іх любімае слова, самае ж нелюбімае — ёсць, бо якраз таго, што найбольш патрэбна, у нас і няма. У тым ліку і ў значнай меры і па віне гэтых шматгадовых кіраўнікоў усіх рангаў.

Асаблівы ваш клопат і ўвага павінны быць звернуты на безальтэрнатыўных кандыдатаў або кандыдатаў з адным (падстаўным!) супернікам, выбары якіх ператвараюцца ў фальш, у пародыю на выбары, і ёсць не што іншае, як абраза тысячаў выбаршчыкаў. Паглядзіце і памяркуйце, хто ідзе на гэта і што ён вам гаворыць. Як ягоныя словы аб дэмакратызацыі і перабудове ўжываюцца са звычаямі сталінскіх часоў. Бо калі б гэтыя людзі мелі элементарны гонар, дык, апынуўшыся адзінымі ў бюлетэні, яны б знялі свае кандыдатуры. Каб не ганьбіць прынцыпы дэмакратыі, гонар партыі Леніна, якую яны прадстаўляюць, уласную вартасць. Дык не. Для іх галоўнае. — улада, не зважаючы ні на што.

Ідучы на выбары, трэба мець на ўвазе, што пэўную частку выбару ўжо зрабілі за вас выбарчыя камісіі. Менавіта гэтыя камісіі, створаныя апаратам і цалкам падпарадкаваныя яму і ягонай міласці, пры рэгістрацыі старанна адмяталі ўсіх, хто не адпавядаў іхнім меркам. Была зроблена няўдалая, аднак, спроба адмесці каля сотні кандыдатаў, вылучаных грамадскімі арганізацыямі, таварыствам беларускай мовы, экалагічным таварыствам. У поўным аб'ёме спроба не ўдалася, аднак нямалая колькасць вартых людзей пераважна з інтэлігенцыі была адхілена пры рэгістрацыі. Затое прайшлі ўсе

партсакратары, раённыя, абласныя і рэспубліканскія апаратчыкі. Цяпер вам галасаваць за іх. Глядзіце і вырашайце самі. Толькі мы хацелі б папярэдзіць: ні ў якім выпадку не байкатуйце выбары. Байкот выбараў, няўдзел у іх — вельмі наруку гэтым апошнім. Яны пра тое толькі і мараць. Ім даволі будзе іхніх паслугачоў з ліку прыбліжаных і падначаленых, рабочай і сялянскай эліты. Абы было мала супроць, і іхняя дарога да ўлады забяспечана.

На апошнім этапе выбараў выключнае значэнне будзе мець грамадскі кантроль за іхнімі вынікамі. Мы ўжо гаварылі, што сабой уяўляюць калі не ўсе, дык шмат якія выбарчыя камісіі, і каму яны будуць служыць. Таму кожная працэдура падліку галасоў павінна быць пад кантролем грамадскасці, сродкаў друку і масавай інфармацыі, аб чым павінны паклапаціцца загадзя.

Воля народа не павінна прапасці марна.

Таму — усе на выбары!

ГАЗЕТА «ПРАВДА»

Лістапад 1989 г.

Цяжкая, пакутная справа — наша рэвалюцыйная перабудова. З пэўнаю верагоднасцю можна сказаць, што нават яе ініцыятары наўрад ці прадбачылі ўсе шматлікія цяжкасці на яе цярністым шляху. Небывалыя ўскладненні ў эканоміцы, фінансах, грамадскіх адносінах, правапарадку. З пагрозлівай катэгарычнасцю заявіў пра сябе нацыянальны фактар, што несумненна з'явілася вынікам яго шматгадовага непрызнання і занядбанасці. Але, можа, самыя цяжкія, ключавыя праблемы ўсё ж знаходзяцца ў стэрэатыпах нашай псіхалогіі, сфарміраванай ва ўдушлівай атмасферы падаўлення, бяздумнага лакейскага падпарадкавання. Сапраўды, зладзіць з гэтамі складанасцямі куды як няпроста, можа, для таго спатрэбяцца гады і дзесяцігоддзі. Часам выказваюцца меркаванні, што нейкі зрух пачнецца хіба пасля змены некалькіх пакаленняў, калі цалкам адыдуць з жыцця цяперашнія носьбіты коснасці і кансерватызму і прыйдуць новыя людзі з інакшым мысленнем, іншымі ўстаноўкамі на маральныя каштоўнасці. Ну, але што ж тады тыя, што жывуць зараз? Няўжо дадзены ім шанс акажацца дарэмным, не рэалізаваным імі, беззваротна ўпушчаным на загадкавых шляхах гісторыі? Магчыма, і з гэтым можна было б прымірыцца, калі б перабудова нагадвала арбу, якую можна спыніць ля прыдарожнай чынары, адпачыць, падмацаваць сілы і пачаць усё спачатку. На жаль ці на шчасце, перабудовачны працэс болей падоб-

ны на перакочванне цяжкага каменя. З неверагодным напружаннем чалавек коціць яго на гару і не можа спыніцца, бо камень зараз жа абрынецца ўніз разам з тым, хто яго коціць, каб абодвум знікнуць у імглістым сутонні гісторыі.

Вядомы заклік перабудовы, які быў асабліва папулярны на яе пачатку і заклікаў пачынаць перабудову з сябе, спярша наводзіў на некаторыя сумненні. Чаму з сябе? Хіба няма спраў болей важных? Хіба дзяржава не знаходзіцца ў стане крызісу? Якое значэнне ў такіх умовах мае асобны чалавек, калі ён нават з'яўляецца кіраўніком пэўнага маштабу. Гісторыю робяць масы! Але чым болей мы ўгразаем у нашых непрадбачаных складанасцях, тым больш відавочнай робіцца бясспрэчнасць гэтага закліку. Мабыць, усё ў свеце ўзнікае з малога і развіваецца ў напрамку да большага — ісціна, добра вядомая ў старажытнасці і, здаецца, трохі падзабытая намі. У дадзеным жа выпадку гутарка ідзе аб унутранай, асабістай гатоўнасці да радыкальных змен у жыцці, якаснага пераўтварэння грамадства. У доўгім шэрагу перабудовачных прыярытэтаў, можа быць, самае галоўнае — усведамленне неабходнасці перабудовы. Быццам элементарнае патрабаванне, але і не самае лёгкае. На ўзроўні масавай свядомасці шмат хто пагаджаецца з тым, што трэба нешта мяняць, але — нешта, кагосьці, ды не самога сябе. А калі і сябе, дык часткова, далёка не ў галоўным і, вядома ж, не ахвяруючы прынцыпамі. Але ўжо наш першы, немалым коштам набыты вопыт перабудовы паказвае, што без ахвяравання некаторымі прынцыпамі, рашучай адмовы ад сумніцельных каштоўнасцей і набыцця каштоўнасцей ісцінных мы не шмат чаго дасягнём. Вядома, у жыцці заўжды важнае значэнне мае вернасць абранай мэце, але, як гэта нярэдка здаралася ў гісторыі, ісціннай мэты можна і не дасягнуць нават пры жыцці некалькіх пакаленняў, хада гісторыі зусім не адэкватна меры чалавечага жыцця. Можна нічога не дасягнуць, але напэўна варта ад чагосьці адмовіцца. Наша мінулае пры ўсёй яго выразнай негатыўнасці, безумоўна, можа саслужыць службу своеасаблівага арыенціра, які настойліва паказвае, як не трэба, чаго трэба асцерагацца. І ўжо напэўна і перш за ўсё — дыктатуры «сильной личности», «твердой руки», супраць якіх, як бы ні складваліся нашыя адносіны з нясталай, толькі што народжанай дэмакратыяй, пратэстуе ўвесь шматпакутны гістарычны вопыт.

Мы шмат і справядліва гаворым аб заганнасці нашай бюракратыі — віноўніцы шмат якіх з нашых бед. Шмат якіх, але далёка не усіх. У шматлікіх бедах вінавата неадэкватная часу, састарэлая ідэалогія, адміністрацыйна-загадны стыль кіраўніцтва, наша далёкая

ад дасканаласці заканадаўчая сістэма, несумненнай заложніцай якой апынулася і наша кіраўнічая бюракратыя. Цяпер у няўстойлівым, перабудовачным соцыуме гэта апошняя шукае гарантый адноснай пэўнасці і перш за ўсё — уласнай сацыяльнай ахаванасці. У нас разгарнулася ліхаманкавая заканатворчасць, у якой заўважаецца ўзаемны недавер заканадаўцаў і выканаўцаў, яўная тэндэнцыя апошніх перастрахаваць на ўсе выпадкі жыцця ўласную выканаўчую дзейнасць. І ў такіх умовах маральныя абгрунтаванасць закона, яго сацыяльны эфект страчвае першаснае значэнне — быў бы закон з яго адназначнай пэўнасцю. Заканатворцы імкнуцца рэгламентаваць як мага болей, калі не ўсе моманты прававых, вытворчых і іншых адносін. Але па меры гэтага імкнення высвятляецца, што чым болей рэгламентуецца, тым больш застаецца нерэгламентаванага. У выніку, як гэта павялося не першы год, ні адзін закон не выконваецца з моманту надання яму правадзейнай сілы, — выканаўцы чакаюць падзаконных актаў і тлумачэнняў. А далей ідзе выкананне гэтых актаў і шматлікіх інструкцый да іх і да закону, якія ўрэшце і непазбежна падмяняюць закон, нярэдка зводзячы ягоны сэнс да супрацьлеглага.

Адно з самых недаравальных злачынстваў сталіншчыны — ліквідацыя традыцыйнай хрысціянскай маралі, спрадвечнай сістэмы элементарных жыццёвых правілаў, звычайна не надта паважанага, але незаменнага ў жыцці здаровага сэнсу. Некалі імі ў поўным аб'ёме валодаў народ, цяпер жа не валодае ніхто. Страціўшы духоўную аснову, грамадства згубіла і нармальны здаровы сэнс, нічога не набыўшы замест: марксізм аказаўся няздольным запоўніць глыбокі духоўны вакуум, які ўтварыўся ў грамадстве. Грамадства ж без маралі наўрад ці здольна дасягнуць шмат у галіне дэмакратычнага права, стварыць дасканалае заканадаўства. Законы, у сваю чаргу заснаваныя на часовай, рэлятывісцкай мэтазгоднасці, з моманту іх прыняцця непазбежна ўступаюць у супярэчнасць са здаровым сэнсам, а нярэдка і з элементарнай логікай. Гэта — мёртванароджаныя законы, у нас іх было нямала ў мінулым і прыбавілася за апошні час. Але мёртванароджаныя законы пазбаўлены карысці ў дэмакратычным грамадстве, — у таталітарным жа яны непазбежна робяцца падставай для дэспатыі і беззаконня.

Напэўна, нельга прызнаць законным закон, які на самым пачатку задуманы для карысці ўлады, скіраваны супраць інтарэсаў народа. У нас далёкая ад дасканаласці Канстытуцыя, няма закона аб рэферэндумах, на працягу некалькіх год ніяк не можа нарадзіцца надта неабходны закон аб друку. Міліцыя і праваахоўныя органы не перастаюць скардзіцца на прававое бяссілле ў барацьбе з апантанай

злачыннасцю. І ў той жа час у крымінальны кодэкс рэспублікі ў якасці тэрміновай меры ўводзяцца артыкулы аб забароне гістарычнай нацыянальнай сімволікі, распаўсюджанні ксеракапіраванай, друкаванай прадукцыі і шмат што іншае. Становіцца адразу зразумелым, чые інтарэсы абараняюць падобныя законы. Мы выкараняем сталінізм, а праваахоўныя органы працягваюць старанна выконваць яго «законы» 1932-35 гадоў, не прызнаючы статус антысталінскіх таварыстваў — усесаюзнага «Мемориала», рэспубліканскага «Мартыралога Беларусі». У мерах па рэабілітацыі нацыянальнай мовы беларусі знайшоў сваё адлюстраванне ўраўніцельны падыход як да беларускай, так і да рускай моваў. Само сабой зразумела, ва ўсе часы для нас быў важны стан рускай мовы ў рэспубліцы. Але ўсе цяперашнія цяжкасці з ёй непараўнальны, з рэальнай пагрозай, перад якой апынулася беларуская мова, што і выклікала абгрунтаваную трывогу грамадскасці. Цяпер выпрацоўваюцца пэўныя доўгатэрміновыя праграмы, адчыняюцца беларускамоўныя класы ў школах, ствараюцца фармальныя і нефармальныя таварыствы па мове. Але ўсё гэта — не больш чым руцінны, па сутнасці, бюракратычны падыход да важнейшай праблемы, звычайныя элементы чарговай «доўгатэрміновай» праграмы, якая, толькі пачаўшыся, выцясняецца наступнай, яшчэ болей «доўгатэрміновай» кампаніяй. Кампартыю ж рэспублікі і яе кіраўнічыя органы моўная праблема пакуль асабліва не кранае, яе адказныя кіраўнікі паранейшаму не валодаюць і не карыстаюцца нацыянальнай мовай, звыкла абыходзячыся без яе. Мабыць, уся бяда ў тым, што на цяперашнім этапе беларуская мова апынулася малапатрэбнай у грамадскім і вытворчым жыцці, якое спрэс ажыццяўляецца на іншай — рускай мове. З жалем і засмучэннем трэба прызнаць, што грамадства, занятае стварэннем матэрыяльнай базы сацыялізму, з нейкага часу перастала дбаць аб культуры і за семдзесят гадоў народнай улады не стварыла ўмоў для патрэбнасці ў нацыянальнай мове, без чаго ўсе меры па яе рэанімацыі надта сумніцельныя. Гібельнае становішча з мовай можна ўратаваць хіба прыняццем комплексу тэрміновых, «аварыйных» мер, і адной з галоўных павінен стаць пераход на яе ўжытак партыйных і савецкіх органаў, Вярхоўнага Савета БССР. Інакш ніякая агітацыя за яе не пераканае беларуса (не кажучы ўжо аб прадстаўніках іншых нацыянальнасцей) авалодаць беларускай мовай, ад якой ён толькі ўчора адвык, калі ёю не хоча валодаць начальства, кіраўнічы авангард рэспублікі. А што гэта так, не трэба нікому тлумачыць: людзі глядзяць тэлевізар і чуюць, як на пытанне па-беларуску кіраўнікі ўсіх рангаў адказваюць на рускай мове. (Выключэннем хіба што быў міністр фінансаў БССР Б. І. Шаціла.) Дык чаго тады варты

ўсе гучныя словы, шумныя і пампезныя гульні ў камісіі і таварыствы, што выпрацоўваюць (доўга і грунтоўна выпрацоўваюць), вядома ж, «доўгатэрміновыя» праграмы, якія не маюць шанцу на выкананне.

І тут не можа не ўзнікнуць спрадвечная праблема правоў, якімі валодае ўлада і валодае народ. Няцяжка заўважыць пэўныя разыходжанні, калі вельмі складаная механіка ажыццяўлення ўлады дзяржаўным апаратам сістэматычна і няспынна ўдасканальваецца, а права народа ў лепшым выпадку галаслоўна дэкларуецца, застаючыся нерэалізаваным.

Са сталінскіх часоў у нас узнікла і ўчэпіста замацавалася практыка адноснасці самога паняцця народ. Калі рэдакцыя цэнтральнай газеты, дзяржустанова або орган улады атрымліваюць пэўную колькасць пісьмаў у падтрымку чарговай пастановы, дык гэта кваліфікуецца як несумненны выразнік волі народа і публікуецца ў друку. Калі ж на гарадской плошчы збіраецца 10-20-50 тысяч на несанкцыянаваны ўладамі мітынг, дык гэта ўсяго толькі «натоўп» і ўсе яго заклікі — не больш чым «патрабаванні экстрэмістаў». Літоўцы збіраюць больш трох мільёнаў подпісаў пад дакументам, які спецыяльнай місіяй адпраўляюць у Маскву, дзе той не знаходзіць ні разумення, ні падтрымкі. Вядомая Балтыйская акцыя трох народаў, у якой прынялі ўдзел некалькі мільёнаў людзей, таксама — «прошукі антысацыялістычных элементаў»? Пры апытанні грамадскай думкі ў Беларусі 99 працэнтаў з 66 тысяч апытаных выказаліся за правядзенне альтэрнатыўных выбараў, што, аднак, не перашкодзіла Вярхоўнаму Савету рэспублікі прыняць артыкул, які дапускае і безальтэрнатыўнае галасаванне. Дык што ж тады голас народа і як яго ўчуць? А галоўнае — як трэба на яго рэагаваць?

У той час, як пад уздзеяннем бурных перабудовачных працэсаў у краіне масавая свядомасць народа значна змянілася, палітычная свядомасць наменклатуры, здаецца, у многіх адносінах застаецца ранейшай — інертнай і кансерватыўнай. Адсюль — непрыняцце ёю палітычнай самадзейнасці шырокіх народных мас, упартае ідэалагічнае і адміністрацыйнае супрацьдзеянне яе імкненням. Нядаўна арганізаваныя народныя франты амаль усюды (апроч хіба Прыбалтыкі) былі ўспрыняты як незаконныя, антысацыялістычныя ўтварэнні і яшчэ да абнародавання іхніх праграм былі расцэнены як крамольныя і падвергнуты праследаванням. Шмат што несумненна дадатнае і, галоўнае, альтэрнатыўнае, народжанае знізу, што неслі іхнія праграмныя палажэнні, засталося за рамкамі працэсаў перабудовы і не садзейнічала яе актывізацыі. Далёкая ад якой-небудзь карэктнасці барацьба супраць арганізатараў і кіраўніцтва франтоў выклікала

залішнюю нервознасць, нічым не апраўданую канфрантацыю ўлад супраць значнай і самай актыўнай часткі грамадства. Грэбуючы сапраўднымі мэтамі перабудовы, бакі распачалі зацяжную палеміку, якая, аднак, не здолела нават праясніць іхнія пазіцыі. У некаторых рэспубліках (напрыклад, на Украіне) бесперспектыўнасць падобнай сітуацыі была зразумета своечасова і зроблены першыя крокі да ўзаемаразумення і супрацоўніцтва. У іншых жа (напрыклад, у Беларусі) улады прадаўжаюць упарціцца ў сваім непрыняцці дэмакратычнага права грамадства на альтэрнатыўнасць праектаў прававых і дзяржаўных актаў, чым ствараецца пэўная напружанасць, якая несумненна тармозіць усе перабудовачныя працэсы. Як ні дзіўна, галоўная стаўка ўлад у гэтай справе робіцца не на палітычную работу ў масах, а на адміністратыўную ўсёдазволенасць і міліцэйскую сілу. Мінулая сесія Вярхоўнага Савета рэспублікі, якая прымала закон аб выбарах, выклікала дзіўную ўстрывожанасць апарату, калі будынак Дома ўрада быў ачэплены ўзмоцненымі нарадамі міліцыі і войск спецпрызначэння, ствараючы тым самым уражанне крайняй напружанасці палітычнай абстаноўкі ў горадзе. Наўрад ці, аднак, гэтая панічная занепакоенасць была чымсьці апраўдана: тыя некалькі сотняў мінчан, што сабраліся перад Домам урада, зусім не збіраліся кідацца на народных абраннікаў — яны чакалі магчымасці сустрэцца і пагутарыць з імі. Аднак замест дэпутатаў ім наканавана было сустрэцца з маўклівымі хлопцамі ў форме.

Нядаўна яшчэ за народам замацоўваўся элементарны абавязак — выконваць гістарычныя планы партыі як свайго кіруючага авангарда. Пабудаваная на вядомых прынцыпах дэмакратычнага цэнтралізму, КПСС, на справе сама знаходзячыся ў падпарадкаванні свайго ядра — ЦК і Палітбюро (хоць бы і праз з'езды і пленумы), у масе сваёй таксама з'яўлялася выканаўчым інструментам. Выстройвалася даволі выразная структурная мадэль, зручная для кіравання зверху, але пазбаўленая неабходнай для кожнай дасканалай мадэлі магчымасці зваротнай сувязі. Калі б усё гэта складвалася інакш, цяпер, мабыць, не давялося б столькі ламаць і перарабляць, амаль усляпую, без навукі і практычнага вопыту прабіваючыся да пачатку дэмакратыі. Цяпер часы ў многім змяніліся, але галоўная мадэль улады застаецца ранейшай. Нават перадаўшы ўладу Саветам, партыя не страчвае магчымасці кіраваць імі праз сваіх членаў, а галоўнае — праз шматвопытны ўласны апарат, які, як гэта вядома з гісторыі, у кожным супрацьстаянні заўжды здабываў перамогу. Здаецца, сапраўды няма ў свеце сілы, якая б магла перамагчы апарат. Мяняюцца часы, прыходзяць новыя пакаленні, масамі авалодваюць новыя ідэі.

Але па сутнасці сваёй апарат не змяняецца — ён служыць рэальнай уладзе.

Даўнішні шматгадовы партыйны вопыт выпрацоўваў вельмі зручную практыку, калі кожная, самая бяскрыўдная крытыка партыйных парадкаў расцэньвалася апаратам як замах на аўтарытэт партыі ў цэлым і крымінальна праследавалася. Усумніцца ў яе палітыцы не дазвалялася нікому — ні яе члену, ні тым больш беспартыйнаму. Член партыі, вядома, быў звязаны партыйнай дысцыплінай, беспартыйнага ж білі «па руках», каб не лез у «чужы агарод». Але ці такім ужо чужым быў той агарод для вялікай большасці насельніцтва краіны, якое, не будучы ў партыі фармальна, тым не менш мусіла існаваць паводле яе законаў, ва ўсім падпарадкоўваючыся яе палітыцы. У аднапартыйнай дзяржаве лёс і тых і другіх ва ўсім залежаў ад партыі — пры адносным удзеле ў ёй яе членаў і абсалютным «партыйным бяспраўі» мільёнаў беспартыйных. Практыка мінулых гадоў аказалася вельмі зручнай формай барацьбы і ў перыяд перабудовы: апарат і наменклатура кожную канкрэтную крытыку ў свой адрас тлумачаць пашырана і зараз жа прымаюць баявую позу абаронцаў — не сябе, партыі. Ці трэба казаць, наколькі гэта ўскладняе дыялог, пазбаўляючы яго і мэты і сэнсу.

Падобным прыёмам для ўласнай абароны карыстаецца і ведамасная бюракратыя, чые карпаратыўныя інтарэсы непрыкметна для грамадства сталі набываць перавагу над дзяржаўнымі і таксама даволі паспяхова былі выведзены з зоны грамадскай крытыкі. І хоць ведамствы — не партыя, але і для іх стала ўласцівым выкарыстоўваць яе аўтарытэт у якасці бранявога шчыта. І на самай справе, ці мог паявіцца ў краіне праект або маглі адбыцца мерапрыемствы, у распрацоўцы і зацвярджэнні якіх не прыняў бы ўдзел той або іншы партыйны орган? Значыцца, само сабой адпала пытанне аб віноўніку ў выпадку няўдачы — вінаваты толькі падазраваўся, застаючыся без пакарання. У выпадку ж поспеху ўсё было зразумела, і ніхто ні ў чым не сумняваўся — асабліва ў аўтарстве гэтага поспеху.

Нават у самыя змрочныя часы нашай гісторыі, у атмасферы ідэйна-маральнага ўдушэння ўсялякага іншадумства лепшыя прадстаўнікі нашай літаратуры і мастацтва ўсё ж рабілі пэўныя спробы сказаць праўду, выявіць прыкметы крызісу, які ў рэшце рэшт ахапіў грамадства. Чаго гэта ім каштавала, цяпер добра вядома. «Служыцелі уз» пільна сачылі за адступленнямі ад канонаў «служыцеляў муз» і бязлітасна распраўляліся з адступнікамі. Цяпер мы скардзімся: мінула чатыры гады перабудовы, а кіно, літаратура, тэатр так і не далі нічога значнага ва ўмовах амаль поўнай свабоды творчасці. Я думаю, з тым

трэба і яшчэ пачакаць — мастацтва і літаратура таксама перабудоўваюцца. Можа, не столькі ў адносінах арганізацыйных структур і формаў, колькі ўнутрана, псіхалагічна. Мабыць, і тут патрэбна змена пакаленняў, каб пазбавіцца ад спрадвечнага заняволення, авалодаць неабходнаю доляй таго капіталу духоўнасці, які апладняў мастацкую класіку і ад якога мы семдзесят год былі адчужаны.

У жыцці кожнага развітога грамадства, побач з духоўнай культурай, бясконца важны таксама практычны, чыста жыццёвы вопыт, які спакваля накопліваецца ў часе. Спрадвечным ягоным накапіцелем у нас было сялянства, наша аграмадная сялянская Атлантыда (па вызначэнню Адамовіча), якая на працягу кароткага часу была спушчана пад ваду з усёй яе спрадвечнай мудрасцю. Літаратуры і мастацтву што-нішто з затопленага ўсё ж удалося ўратаваць, але колькі страчана беззваротна! Гаспадарчы ўклад, земляробчая навука, нормы маралі. Колькі пайшло ў нябыт, пралілося са слязьмі і крывёю! З пачатку перабудовы, дзякуючы самаадданым намаганням сродкаў масавай інфармацыі, мы шмат чаго даведаліся аб нашым нядаўнім мінулым, але ці даведаліся пра ўсё? Далёка па свеце разышлася сумная слава нашых Курапат, але хіба Курапаты ў нас адны? Толькі пасля першых публікацый аб раскопках у гэтым ляску пад Мінскам паявіліся дзесяткі паведамленняў аб падобных магілах амаль з усіх абласных цэнтраў рэспублікі, шмат з якіх раёнаў і гарадоў. Хто там ляжыць, каго расстрэльвалі на працягу шмат гадоў, а галоўнае — хто каты? Адказу на гэтыя пытанні дагэтуль няма. Кажуць, не захаваліся архівы, а тыя, што захаваліся, закрыты на вечны замок. Але вось Д. Юрасаў нядаўна паведаміў у друку, што ўжо ў 1987 годзе знішчаны архіў Вярхоўнага суда СССР, усе яго сумныя і крывавыя справы. Навошта гэта? Ствараецца ўражанне, што недзе ёсць сілы, якія зусім не зацікаўлены ў раскрыцці даўніх сакрэтаў. Ці можна прызнаць таксама, што літаратура і мастацтва ў пэўнай меры выпрацавалі ў грамадстве арганічную патрэбу ў праўдзе, якой бы непрыгляднай тая ні была. Яшчэ не загаіліся крывавыя раны мінулага, а ўжо чуваць настойлівыя галасы: хопіць, надакучыла! Даволі аплёўваць гісторыю! Некаторыя вельмі напалохаліся самі і хочуць гэтак жа напалохаць іншых. Раздаецца лямант у газетах і часопісах: усё прапала, яўрэйская змова, нашэсце масонаў і кааператараў, радыкалы рвуцца да ўлады! Ратуйце сацыялізм, марксізм і заадно нас, харошых! Як ратаваць? Можа, спосабам устанаўлення надзвычайнага становішча з усімі яго шырокімі вынікамі? Але перш варта было б успомніць што-нішто з гісторыі, у якой надзвычайныя меры нярэдка рабіліся жорнамі, што выдатна

малолі не толькі тых, для каго прызначаліся, але і сваіх стваральнікаў. Мабыць, такая ўжо ўласцівасць гэтых крывавых жорнаў. Самы навейшы вопыт палітычнага жыцця Арменіі, Грузіі, Малдавіі сведчыць менавіта аб тым. Сіла супраць народа, у тым ліку і самая «законная», «канстытуцыйная», звязанае з ёю насілле — справа дужа рызыковая для абодвух бакоў, якія плацяць за яе аднолькава незалежна ад таго, чыя перамога. Адны, бывае, плацяць крывёю, другія — кар'ерай. Такія законы дэмакратыі, нават самай недасканалай і хілай.

На працягу стагоддзяў народы клапатліва гадуюць магутны молах улады, які нярэдка ператвараецца ў монстра, што зжырае іх і самога сябе. Але на тое ён і монстр, каб зноў узрадзіцца на крыві мільёнаў у сваім ранейшым абліччы, распаўсюджваючы вакол смярдзючае пачуццё страху. Страх нядаўна яшчэ зверху данізу пранізваў наша грамадства. Будучы самым разнастайным па сваёй прыродзе, ён, хоць і ў аслабленым стане, дагэтуль жыве ў пачуццях значнае часткі грамадства. У якасці ахоўнага для сябе сродку бюракратыя выпрацавала мноства жыцейскіх і прафесійных хітрасцьей, галоўнай з якіх несумненна з'яўляецца амаль інстынктыўнае імкненне да перастрахоўкі, ухіленне ў сваёй дзейнасці ўсякай рызыкі. Шматгадовы гаротны вопыт адбіў ахвоту да ініцыятывы, прымусіў да ўсеагульнай уніфікацыі палітычных, гаспадарчых і іншых поглядаў. Але хіба можна ажыццявіць грандыёзныя планы перабудовы на аснове коснасці і аднастайнасці? Палітычная і гаспадарчая ініцыятыва прыбалтыйскіх рэспублік — рэдкі прыклад пераадолення звыклага страху, рашучы прарыў у нязведаную сферу рызыкі, без якой цяпер, здаецца, наогул няма выйсця. Але, мабыць, іншага шляху з мінулага ў будучыню нам не дадзена, і мы таксама рана ці позна рушым следам за прыбалтамі. Як гэта бывае, тут жа забыўшыся, чаго ім каштавала іх рызыковая ініцыятыва.

У тым, што цяпер адбываецца ў краіне, вялізная, калі не сказаць рашаючая, роля належыць інтэлігенцыі. Усім добра вядома гістарычная роля рускай інтэлігенцыі ў сацыяльным прагрэсе і сацыялістычнай рэвалюцыі, зараз яе значэнне ў тым не зменшылася. Не дзіва таму, што інтэлігенцыя ў цэнтры і ў рэспубліках стала той грамадскай сілай, якую з лютасцю атакавалі антыперабудовачныя сілы, як звычайна, нацкоўваючы на яе рабочы клас. Да гонару рабочага класа Беларусі трэба зазначыць, што з гэтага, раней даволі эфектыўнага прыёму мала што атрымалася: рабочы клас ужо займеў уласны розум і навучыўся кіравацца не толькі класавым, але і чалавечым пачуццём. Але што ж інтэлігенцыя? Нясмелыя адзіночныя пратэсты ў маладзёжных газетах, на тэлебачанні, часам бурныя выступленні на сходах і

прыняцце рэзалюцый, якія далей сейфу не ішлі. А так паглыбленне ў свае прафесійныя інтарэсы, апатыя і ўвогуле ад палітычных рухаў у рэспубліцы. Сапраўды, як гаварыў Ніл Гілевіч, па тэрытарыяльных і нацыянальна-тэрырытарыяльных акругах Беларусі ў народныя дэпутаты СССР не абраны ні адзін пісьменнік, ніводны мастак ці артыст. Несправядлівасць гэтага факта ўражвае, але і наводзіць на развагі: чаму так атрымалася? Ці не таму, што некаторыя творчыя саюзы рэспублікі апынуліся на мяжы страты даверу? За доўгія часы сталінскага тэрору, у застойны брэжнеўскі час шмат хто з іх членаў дэвальваваўся як сацыяльная асоба, усе свае здольнасці скіроўваючы на сацыяльны канфармізм, прыслужніцтва перад уладай. Мабыць, выбаршчыкі мелі падставы ўсумніцца ў палітычнай дзеяздольнасці не толькі некаторых нацыянальных майстроў, але і цэлых саюзаў. На саман справе, чаго цяпер варты творчы саюз, які даўно страціў здольнасць адстойваць уласныя, так сказаць, карпаратыўныя інтарэсы, абыякавы да свавольства начальства ў адносінах да яго членаў, мясцовых уотэргейтаў і вобыскаў ва ўласным Доме літаратара. Адпаведныя і адносіны да яго і ўлады. Дык ці варта здзіўляцца, што замест імянітых кіраўнікоў такіх саюзаў выбаршчыкі аддалі перавагу безыменным «тэхнарам», якія, можа, і не маюць асаблівых вартасцей, але і не дэманструюць палітычнае віхлянне паміж разлікам і ісцінай.

Прыклад заўжды важны ў вялікім і малым, прыклад — гэта канцэнтраваная частка вопыту. Нават калі гэты вопыт і з адмоўным вынікам. Вельмі шкада, што ў наш час амаль на нішто зведзены старадаўні звычай зважаць на прыклад, пазіцыю народных аўтарытэтаў, думкі патрыярхаў сумлення, якія значылі калісьці не менш (калі не больш), чым высокія афіцыйныя аўтарытэты. Ерэтычныя пропаведзі Льва Талстога былі калісьці важней за артадаксальныя прамовы старшыні Дзяржаўнай думы Маклакова. Прынята думаць, што значныя аўтарытэты засталіся ў мінулым, вывеліся ў наш час. Але гэта не так. У народных нетрах не пераводзяцца светлыя галовы і сумленныя сэрцы, трэба толькі ўмець іх бачыць. Галоснасць апошніх гадоў, прэса і тэлебачанне, дыскусіі на з'ездзе народных дэпутатаў і ў Вярхоўным Савеце выявілі побач з традыцыйным кансерватызмам і глыбокую, прагрэсіўную думку сумленных і разумных людзей, чые аргументы, на жаль, не заўсёды знаходзяць прызнанне большасці. Цяжка сказаць, у чым тут справа: у элементарнай чыноўніцкай абмежаванасці ці звычаі мінулых гадоў, калі кожны аўтарытэт толькі тады што-небудзь значыў, калі яго вылучалі ўлады. Абавязковаю ўмовай такога вылучэння і падтрымкі з'яўлялася безумоўнае згодніцтва з уладамі. Менавіта гэтае згодніцтва

ўрэшце і пляжыла рэпутацыю не аднаго разумнага і нават сумленнага мастака таго часу. Далёка не ў кожнага з іх, надзеленага сумленнем і розумам, хапала сілы характару, каб ва ўсіх выпрабаваннях лёсу застацца верным сабе, ісціне і болей нікому. Наменклатурныя ж велічыні ўсіх рангаў, як бы высока ні ўзносіліся, заканчвалі поўным забыццём адразу ж пасля сыходу з палітычнай сцэны.

Па ўсёй верагоднасці, у нашай перабудове трэба адрозніваць дзве галоўныя сферы: духоўную і матэрыяльную, якія аднолькава састарэлі за папярэднія дзесяцігоддзі і маюць патрэбу ў карэнных зменах. Абедзве яны паддаюцца тым зменам з велізарнай цяжкасцю, аб якіх-небудзь прыкметных выніках, мабыць, гаварыць яшчэ рана. Але ёсць надзея. На мой погляд, яна заключаецца ў двух аспектах. Папершае, гэта несумненны, амаль рэвалюцыйны (у рамках нашага светапогляду) паварот ад фальшывых, надуманых догмаў да выпрабаваных у стагоддзях агульначалавечых каштоўнасцей. І, падругое, — маруднае, цяжкае, але непазбежнае ўкараненне ў нашай хворай эканоміцы элементарнага, занядбанага раней здаровага сэнсу, які адзін толькі можа прывесці да поспеху — даць значную прыбаўку грамадскага прадукту.

Напэўна, гэта надзея збудзецца няхутка і, можа, не ў той меры, у якой хацелася б. Але што вялікае і жаданае збываецца ў жыцці хутка і цалкам?

ПРЕДИСЛОВИЕ К ДВУХТОМНИКУ ВЛАДИМИРА КОРОТКЕВИЧА. ИЗДАТЕЛЬСТВО «ХУДОЖЕСТВЕННАЯ ЛИТЕРАТУРА»

1990 г.

Владимир Короткевич — писатель удивительного дарования, блестяще проявивший себя во многих литературных жанрах. Его проза столь же богата и совершенна, как и его поэзия, строгий реализм его рассказов на современные темы естественно сочетается с возвышенным романтизмом исторических повествований. Кроме того, он неистощимый выдумщик. Даже люди, близко знавшие его, не всегда могли различить, что в его произведениях от реального, а что является плодом изощренной писательской фантазии. Следует заметить, однако, что эта его раскованность и разносторонность лишь умножали его творческие возможности, которые всегда проявлялись бурно, дерзко и талантливо.

Он был из породы тех яростных жизнелюбов, которые нечасто встречаются в жизни и еще реже осуществляются в искусстве. Можно

сказать, что в этом смысле он был человеком редким. Даже в зрелые годы он счастливо сочетал в себе человеческую мудрость с почти детской непосредственностью, простодушием баловня природы. Непосредственность его натуры, ничуть не принижая его достоинств, давала основание друзьям по-хорошему удивляться, а то и восхищаться его неординарностью. Он любил все натуральное, легкое и радостное как в повседневности бытия, так и в непростых проявлениях человеческих отношений. Его привязанность к жизни вообще не знала границ, и в ней он всегда находил место для необычайного. Эту необычайность он умел разглядеть всюду, подметить острым художническим глазом, чтобы обогатить и преобразовать затем в горниле своего воображения. Многим из пережитого и увиденного имел обыкновение делиться с друзьями, и, случалось, ему не верили, хотя все, о чем он рассказывал, было сущей правдой. Но все дело в том, что многое он видел по-своему, как может видеть только своеобразный художник.

Широко известна его безграничная влюбленность в литературу, искусство, национальную старину и историю. Его талант, будучи по природе своей поэтически-возвышенным, не гнушался простого, обыденного как в сфере творчества, так и в отношениях с друзьями, коллегами и читателями. Естественность и простота этих отношений могли удивить некоторых, но тот, кто знал его хорошо, не удивлялся: это был всегдашний, привычный и естественный Володя Короткевич.

Высокая доброта его натуры в отношении к ближнему, казалось бы, требовала взаимности, давала основание что-то брать от других — для себя. Но мы знаем, что это было не так. Он не требовал ничего и редко что брал, потому что принадлежал к числу тех действительно редких теперь бессребреников, которые способны лишь отдавать, одарять, не требуя ничего взамен. И до последних дней он раздавал направо и налево, все черпая из щедрот собственной души, сокровищницы своего недюжинного таланта.

Впервые его имя появилось в печати в 1955 году под стихотворением «Машека», помещенным в журнале «Полымя». Затем стихи Владимира Короткевича продолжительное время печатались в разных изданиях, вышли в трех поэтических сборниках, которые были единодушно одобрены критикой и с интересом встречены читателем. Действительно, уже тогда стало ясно, что в лице молодого автора белорусская поэзия обрела яркое и самобытное дарование, исполненное поэтической возвышенности, смелой метафоричности и глубины. (Наверно, тут кстати будет отметить, что стихами он и кончил. Его посмертный сборник «Был. Есть. Буду» — поэтическое завещание

грядущим поколениям, созданное трепетной рукой мастера. Поэзия все время сопровождала его талант, жила в его строках даже тогда, когда он создавал вовсе не поэтические произведения).

В рассказах, которые В. Короткевич начал писать одновременно со стихами, также наличествовали многие приметы его поэтического дара, некоторые из них читались как стихи в прозе. Можно даже сказать, что ранняя повествовательная проза В. Короткевича дала ее автору новые творческие возможности, нисколько не сужая его поэтической сущности. Влюбленность в жизнь и ее разнообразные проявления зазвучала в ней в полный, ничем не приглушенный голос. Для критиков и поклонников таланта В. Короткевича были все основания полагать, что их кумир надолго останется в пределах им избранного, такого привлекательного для многих жанра. Но, как ни парадоксально, именно в это время в таланте В. Короткевича появилась, надолго утвердившись, новая склонность — углубленный интерес к историческому прошлому народа.

По всей видимости, это также можно понять. При довольно развитых фольклорных и поэтических жанрах белорусской литературе долгое время недоставало исторической прозы. Драматическое и трагическое содержание исторических событий, которым так богато прошлое нашего народа, почти не оставили литературных свидетельств и, конечно же, находились вне пределов личного опыта позднейших поколений литераторов. Для художественного воплощения прошлого литература испытывала потребность в таланте особого рода. Обладая богатым запасом конкретных исторических знаний, он должен был иметь яркое поэтическое воображение, чтобы из седого прошлого черпать вдохновение для конкретного творчества. (Справедливости ради следует заметить, что это прошлое все же не оставалось никем не тронутым: за последние десятилетия белорусскими авторами предпринимались определенные попытки проникнуть в историю края, но это проникновение не шло дальше середины либо второй половины XIX столетия. Особый интерес вызывала легендарная фигура Кастуся Калиновского, о котором в разные времена были созданы произведения в разных литературных жанрах.)

Получилось так, что именно Кастусь Калиновский и трагическое восстание 1863 года привлекли внимание Короткевича-прозаика, и в белорусской печати появился первый, а затем и второй том его исторического романа «Колосья под серпом твоим». Об этом романе в свое время высказывались разные суждения. Оценки, исполненные восхищения, чередовались с серьезными упреками автору, которые также можно понять по-разному. Но уже тогда было несомненно, что

при всей спорности некоторых трактовок и положений, такой широты охвата исторической эпохи и такого проникновения в нее еще не было в белорусской прозе. Произведение это, к сожалению, осталось не законченным.

В 1964 году журнал «Маладосць» опубликовал историко-приключенческий детектив «Дикая охота короля Стаха» — одно из самых популярных произведений Владимира Короткевича. Сразу после появления в журнале оно было переведено на другие языки, впоследствии экранизировано, в киноварианте обошло многие экраны мира и удостоено Оскара, высшей награды США. «Дикая охота» — несомненно, удачная попытка проникновения в историю Белоруссии, правдивое постижение ее драматического прошлого. В отличие от других, зачастую густо населенных произведений Владимира Короткевича, тут не много действующих лиц, почти все события происходят в имении Болотные Ялины и вокруг него. Созданная по излюбленным канонам приключенческого жанра, повесть содержит в своей структуре и что-то отличное от него, какую-то свойственную ей тайну, которую трудно понять, можно разве что почувствовать. И дело тут, конечно, не только в особой романтической атмосфере или в напряженности приключенческого сюжета (кстати, мастерски разработанного автором), не в пугающе-загадочных сценах кавалькады «дикой охоты», рыскающей на таинственных «дрыгантах» по лесным окрестностям. Тут впечатляет что-то более высокое, несомненно идущее из недр исторических времен, блестяще запечатленных в произведениях литературного романтизма Майн Рида, Вальтера Скотта, Генриха Сенкевича. Во всяком случае на примере этой повести лишний раз убеждаешься, какой положительный результат дает гармоническое сочетание определенного характера литературного таланта и подлежащей ему творческой задачи. В «Дикой охоте короля Стаха» все сошлось в своей золотой мере.

Между тем талант Короткевича — исторического прозаика продолжал развиваться и обретал новую силу. На протяжении двух десятилетий в печати регулярно появлялись его новые прозаические произведения, навеянные драматическими перипетиями нашей истории. Среди них значительное место занимает приключенческо-романтическая история Христа, который «приземлился в Городне» и жанр которой не без легкой иронии обозначен автором как «евангелие от Иуды». Книга эта отличается от других произведений данного жанра многими положительными качествами: основательностью исторического мышления, богатством и художественной выразительностью описаний, местами напоминающих живопись Иеронима Босха. В

ней с блеском проявились авторские способности точно и просто создавать многочисленные образы различных сословий: ремесленников, торговцев, простолюдинов, а также магнатов и духовенства того далекого времени, от которого не много осталось даже скупых исторических сведений. Однако наибольшая ценность книги, пожалуй, в ее четких гуманистических установках, изобличении того, что касается «власть придержащих», которые в своей жажде корыстного не останавливаются ни перед пролитием крови, ни перед фальшью высоких слов. Читателя привлекает длинная череда временами смешных, а чаще устрашающих событий в пределах старой Городни и в ее окрестностях. В этих событиях участвует группа невольных авантюристов во главе с «мужицким Христом» Братчиком, у которого медленно зреет социальное самосознание и с ним — готовность постоять за правду простых людей. Читателя не могут не поразить с брейгелевским размахом созданные картины городского и сельского быта, ужасающие баталии на «костоломных башнях» Городни. Но наибольшее впечатление, пожалуй, остается от финальной главы романа, когда после долгой борьбы и кровопролитий наступает покой и Братчик с друзьями, послав Иуду за водкой, берут сеялки и начинают засевать осеннее поле.

Исторический и приключенческо-романтический жанр на ряд лет стал излюбленным литературным жанром Владимира Короткевича. Непрестанное изучение прошлого по архивным и литературным источникам, многолетнее вдумчивое осмысление атмосферы, духа, психологии людей давних времен выработало у автора определенное художническое чувство материала, обычно малодоступное другим писателям. Из-под его пера выходят все новые произведения, посвященные истории и неизменно отмеченные лучшими чертами его неповторимого таланта.

В предпоследний год своей жизни он заканчивает «Черный замок Ольшанский» — эту «наполовину безделушку, в которой, однако, также есть спрятанный смысл и еще кое-что», — как писал он на одной из своих книжек. Понятно, это вовсе не «безделушка», просто Короткевичу свойственна такая, как бы упрощенная, манера отношений к собственным произведениям — чеховская манера уничижительных оценок результатов своего труда. В этом произведении автор удачно соединил в целое события и образы разных времен, исследовал их взаимосвязь и влияние на формирование нравственной атмосферы нашего сегодня. Роман читается с увлечением, его обостренный сюжет, как и совершенное языковое мастерство, обеспечили ему блистательный успех среди широкого круга читателей. Так же, как и

— Усё будзе залежаць ад палітычнай волі грамадства.

І тут узнікае пытанне: ці валодае наша беларускае грамадства якой-небудзь выразнай палітычнай воляй? І нават так: ці ёсць у нас тое палітычна свядомае нацыянальнае грамадства? Прынамсі, дагэтуль не было ніколі. Улада цвёрдай рукі, дыктатура, пра якую марыць наменклатура і добрая частка людзей працоўных, адкіне нас не ў эпоху «класавых баёў», а ў адзін вялікі канцлагер, Дзе будзе выдатны лагерны парадак, лагернае аднадумства, лагерны тэрор. І будзе парадак — роўны і дакладны. Кожны будзе жыць строга па рэгламенце — гадзіна ў гадзіну: жыць, працаваць і паміраць. Усё — строга па норме, у свой час. Пры поўнай згодзе. І ні табе мітынгаў, ні забастовак, ні нефармалаў, ні апазіцыі. Затое будзе Вялікі, Шаноўны, Усімі Любімы Правадыр — Дыктатар. Як, зрэшты, ужо і было. Мабыць, у нас інакш, не бывае.

Зноў жа варта зазначыць «з усёй бальшавіцкай праматой», як некалі прынята было гаварыць, што падзел грамадства даўно страціў класавы характар. Класавая і нават партыйная прыналежнасць ужо нічога не азначаюць, бо сапраўдны антаганізм, як гэта слушна заўважыў нядаўна Алесь Адамовіч, праходзіць па лініі «сексоты-несексоты», і цяжка сказаць, каго цяпер у нас болей. Напярэдадні вайны, паводле сведчання сына Георгія Малянкова, вучонага А. Малянкова (часопіс «Журналіст», № 2, 1991 г.), сексотаў было ў нас 10 мільёнаў. Цяпер, трэба думаць, болей, і яны складаюць магутную дзейсную сілу тых, хто выйшаў з акопаў на свой апошні і рашаючы бой.

— Вы сказалі, што пра дыктатуру трызніць не адно толькі чыноўніцтва. Сапраўды, ад простых людзей часам чуеш: хопіць гэтага вэрхалу, патрэбна моцная рука. Людзі, здаецца, згодныя на любога Сталіна — толькі б хлеб у крамах быў. Нездарма ж кажуць — кожны дыктатар прыходзіць у абліччы выратавальніка. Як вы лічыце, цяперашні эканамічны развал — заканамерны вынік сацыялістычнай сістэмы, следстве нейкіх першапачатковых памылак 1985 года альбо — правакацыя з мэтай укараніць у псіхалогію чалавека неабходнасць «жорсткай рукі»? Ці — усё разам?

— Толькі каб быў хлеб у крамах... Хлеба яшчэ трохі ёсць — не хапае дыктатара... Але ён будзе.

Мне думаецца, што цяпер, у святле ўсяго, што адбываецца, толькі дурны ці зламыснік можа сцвярджаць, што сацыялізм яшчэ не вычарпаў сябе, што недзе ёсць добры, лагодны, з чалавечым тварам сацыялізм, да якога трэба імкнуцца. Яно, можа, дзе і ёсць, але ўжо ў нас ніякага быць не можа. У нас не атрымліваецца інакшы, чым той, які мы мэнчылі сем дзесяткаў гадоў, і на тым выдахліся дашчэнту.

На добры розум, дык, пасля ўсяго перажытага, нам трэба б абвясціць па-за законам усё сацыялістычнае словаблудства, таксама як і тых ідэолагаў, якія зрабілі з яго сабе пажыццёвую прафесію, каб яны сваёй ідэйнай парнаграфіяй не разбэшчвалі людскія душы. Нават і ў выпадках, калі тое разбэшчванне мае «не вельмі высокі інтэлектуальны ўзровень».

Звычайна палітычныя партыі ладзяць жыццё калі не на карысць усяго народа, дык хоць бы дзеля ўласных інтарэсаў, дзеля дабрабыту сваіх членаў. Камуністы ж — ні для сябе, ні для народа. У лепшым выпадку дзеля вузкага кола кіраўнічай эліты. А так — дзеля мёртвых утапічных ідэй, дзеля бясконцага множання ракет і танкаў, касмічнай прапаганды, дзеля Кубы, Анголы, Афганістана. Зноў жа, не ў інтарэсах жабрацкіх народаў гэтых краін, а дзеля ўладных амбіцый мясцовых імператараў-авантурыстаў, якія за БМП і аўтаматы Калашнікава гатовы часова прыняць камуністычную веру. У той жа час уласны народ працягвае гібець у голадзе і нэндзе. І пасля ўсяго сказанага ў некаторых з нашых кіраўнічых камуністаў хапае наіўнасці пытацца: завошта народ так ненавідзіць сваю кампартыю, якая першай пачала перабудову.

Перабудову-то пачала, ды ў які кірунак яе павярнула?

Увогуле можна зразумець нязрушную прыхільнасць камуністаў да «сацыялістычнага выбару» (калі толькі можна «выбарам» назваць узброены захоп улады). Іх яўны, фантасмагарычны сацыялізм, арганічнае непрыняцце прыватнай уласнасці — гэта тое адзіна магчымае асяроддзе, пры якім і можа існаваць кампартыя; без таго яна не можа знайсці ніякай жыццёвай асновы ў грамадстве. Гэта партыя ўяўнага, «бібліятэчнага» сацыялізму, з адменай ці пагібеллю якога рассыпаецца ўшчэнт яе няўклюдны прагматызм і яе змярцвелая ідэалогія. Таму, пакуль яна будзе пры ўладзе, яна не пацерпіць побач ніякую іншую ідэалогію, іншы грамадскі лад. Яна будзе ўпарта будаваць усё той жа сацыялізм, бо нічога іншага будаваць не хоча і не ўмее. Але ўся справа ў тым, што і з гэтым будаўніцтвам у яе нічога не атрымліваецца. У тым і бяда нашай гісторыі, трагедыя нашага народа. Краіна апынулася ў вузкай цеснай нары, з якой няма ходу ні ўзад, ні ўперад.

— Але вось некалькі цытат з выступленняў на апошнім пленуме ЦК КПБ: «...так жорсткі адпор прыхільнікам так званага Балтыйска-Чарнаморскага Саюза і іншым сепаратыстам», «напомню словы Івана Кузьміча Палазкова, сказаныя на Пленуме ЦК КПСС, — аб тым, што палітыку нельга рабіць дрыжачымі рукамі і дрыжачым голасам. Вось арыенцір усім нам, — ад радавога камуніста да Генеральнага

сакратара». І, нарэшце: «Кампартыі Беларусі няма у чым каяцца перад сваім народам»...

— Каяцца трэба ўсім перад усімі.

Вядома, апроч камуністаў. Тыя не пакаюцца, бо дужа разлічваюць на палітычны рэванш, які яны маюць намер ажыццявіць без дрыжыкаў у руках і без сумненняў у пачуццях. Як гэта ўжо было неаднойчы. А іншым... Народу? Не пашкодзіла б і народу. Ужо хоць бы перад гісторыяй і наступнымі пакаленнямі — за тое, што на стагоддзе затрымалі прагрэс, на крывавых недарэчнасцях зацыклілі нашу гісторыю, што менавіта па нашай віне нашы нашчадкі і ў XXI стагоддзі будуць жабракамі, прынамсі, самымі беднымі ў Еўропе. І гэта пры такіх рэсурсах і такіх геапалітычных магчымасцях...

— Ужо багата сказана і пра юрыдычную некарэктнасць фармулёўкі пытання будучага рэферэндуму. І пра палітычную сумніцельнасць гэтай акцыі. І ўсё ж — ці будзе вынік рэферэндуму мець нейкі істотны ўплыў на далейшыя працэсы ў рэспубліцы і ў СССР? Дарэчы, група дэмакратычных дэпутатаў у Вярхоўным Савеце Беларусі прапанавала наступную фармулёўку пытання ў бюлетэні: «Ці лічыце вы, што СССР павінен быць ператвораны ў Саюз Суверэнных Рэспублік шляхам заключэння прамых міждзяржаўных пагадненняў паміж Беларуссю і іншымі суверэннымі дзяржавамі?»

— Навошта ўсенародны рэферэндум, калі Вярхоўны Савет Беларусі прыняў ужо пастанову: «Прызнаць мэтазгодным уваходжанне Беларускай ССР у склад Саюза ССР». Такім чынам, усё ўжо вырашана за месяц да ўсенароднага рэферэндуму.

Канцэпцыя гэтага рэферэндуму лішні раз сведчыць, што мы ніколі не вырашаем свой лёс — за нас тое робяць іншыя. Ставяць свае ўмовы, фармулююць наша рашэнне, маніпулююць народнаю воляй. Мы зноў у каторы раз трапілі ў зачараванае кола: каб вольна і па справядлівасці вырашыць пытанне дзяржаўнага суверэнітэту, трэба быць суверэнным народам. А каб быць суверэнным народам, трэба мець дзяржаўны суверэнітэт. Каторы раз успомніш славутае: «так» альбо «не», а ўсё астатняе — ад нячысціка.

Баюся, тут усё — ад нячысціка.

— Каторы раз пераконваешся, што палітычная наша бездапаможнасць — кроўнае дзіця нацыянальнага нігілізму, знявагі культуры і мовы...

— Нашы слёзныя скаргі на агонію нацыянальнай мовы даўно сталі агульнай рытарычнай мясцінай. Цяпер ужо пэўна відаць, што папяровыя законы ды імітацыя бюракратычнай актыўнасці апошніх гадоў маюць на мэце замаскіраваць ад народа тую агонію, выдаць яе

за культурную рэанімацыю. У гэтай сувязі ні чым іншым, як непрыхаваным крывадушшам, нельга растлумачыць «хітравумную» пазіцыю тых беларускіх літаратараў, якія так гучна крычаць у абарону нацыянальнай мовы, а самі навыперадкі кідаюцца да супрацоўніцтва з КПБ — гэтым зацятым магільшчыкам нацыянальнай культуры. У той час як сумленныя людзі тысячамі здаюць партбілеты, гэтыя дамагліся членства ў яе кіруючых органах. Кінуты, так сказаць, на іх інтэлектуальнае ўмацаванне. Ці яны думаюць, што з цэкоўскіх вяршынь ім будзе зручней давяршыць тое, што не ўдалося давяршыць з колішніх шматгадовых пасад сакратароў СП Беларусі? Калі так, то яны маюць рацыю: болей беларусканенавіснай сілы, чым тая, якой яны служаць, на Беларусі, мабыць, не будзе. Што ж, тады застаецца пажадаць ім поспеху. З гэткімі тэмпамі напрыканцы стагоддзя пастаўленая імі задача будзе выканана поўнасцю.

— Сапраўды, існуе, відаць, нейкая мяжа, пасля якой кампраміс палітычны пераўтвараецца ў кампраміс маральны... Тым не менш, аналізуючы дзейнасць дэмакратаў — у прыватнасці, парламенцкай апазіцыі ў ВС БССР, — некаторыя папракаюць нас у імкненні да канфрантацыі, свядомым жаданні ісці на абвастрэнне канфлікту паміж палітычнымі сіламі.. Усё часцей чуецца: «Ідэі вашым неблагія, але вось форма іх ажыццяўлення... Не, хлопцы, вы, калі прыйдзеце да ўлады, будзеце яшчэ горшыя за бальшавікоў, пачнеце вешаць камуністаў». Гэта — у горшым выпадку, ну а ў лепшым: «Палітыка — майстэрства кампрамісу». Якой вам, Васіль Уладзіміравіч, бачыцца цяперашняя тактыка дэмакратычнага руху?

— Мне бачыцца вельмі незайздроснай доля нашай парламенцкай апазіцыі, якая рупіць нялёгка і ў значнай ступені марна. Уціск партыйнай большасці праяўляецца штодня — у вялікім і малым. Гэта мы бачым на шматлікіх прыкладах — ад выключэння мікрафонаў перад дэпутатам Сямдзянавай да агідных персанальных нападкаў на нібыта валютныя «заробкі» дэпутатаў на радыёстанцыі «Свабода», якая, як вядома, ганарару не плаціць. Ні ў марках-доларах, ні нават у «драўляных» рублях.

Сюды ж адносіцца і шалёны дэпутацкі націск на друк, у прыватнасці на самую, можа, дэмакратычную цяпер «Народную газету». Прывучаная за шмат гадоў да безумоўнай паслухмянасці «рэптыльнай прэсы», пэўная частка дэпутатаў бачыць гэтую прэсу толькі ў ролі абслугі, песняра і апалагета менавіта той партыі, да якой сама належыць. Безумоўна, у тым адзнака пэўнага ўзроўню дэпутацкай маральнасці, не кажучы ўжо пра дэмакратызм, побач з якім такія норавы не стаялі і блізка. Мабыць, да тых жа метадаў

адносяцца і запалохванні наконт таго, што будзе, «калі вы прыйдзеце да ўлады». Тое, што тады будзе, вельмі няпэўна і праблематычна, а вось што было пры іхняй уладзе — у тым выдатна пераканаўся ўвесь белы свет. Прынамсі, дагэтуль дзякуючы тэлебачанню і асабліва радыё беларускі люд мог назіраць і слухаць, як і што робіцца ў ягоным парламенце.

Але менавіта тое надта ж напалохала некаторых дэпутатаў, якія ўрэшце дамагліся шчыльна зачыніць дзверы Дома ўрада, каб ніхто нічога не чуў і не бачыў. Але ж добрыя справы ад людзей не хаваюць.

Зрэшты, падобны метад «самаедскага парламентарызму» знайшоў сваё перайманне і ў саюзным Вярхоўным Савеце. З апошніх падзей такога роду можна нагадаць абмеркаванне тэлевізійнага выступлення Барыса Ельцына, калі тое абмеркаванне набыло форму нястрымнай жаночай істэрыі, зададзенай, дарэчы, выступленнем менавіта беларускай дэпутаткі. Або выступленне маршала Ахрамеева з настойлівым дамаганнем адмяніць тэлетрансляцыю сесіі, бо, ці бачыце, яна пагражае моцы савецкай сям'і.

Па ўсім відаць, дэмакратычны рух у сучасным посттаталітарным грамадстве не шмат што здолее. Мабыць, сучасныя варункі абавязваюць дэмакратаў да адзіна магчымага — не даць канчаткова скампраметаваць сябе антыдэмакратычным сілам, неяк зберагчы свае ідэалы, да якіх калі-небудзь можна будзе вярнуцца.

Калі для таго прыйдзе час...

ВЫСТУПЛЕННЕ НА КАНГРЭСЕ ЗГУРТАВАННЯ «БАЦЬКАЎШЧЫНА»

Красавік 1991 г.

Вялікі і ўсёмагутны Божа стварае чалавека па вобразу і падабенству свайму — строга індывідуальна, паасобку, з уласным жыццём і адметным ад іншых лёсам. Так бы і жыць паасобку. Ды паасобку нельга, надта нас шмат, і трэба неяк дамаўляцца, каб жыць гуртам і ў згодзе. Жыць па справядлівасці.

На жаль, нават пасля столькіх стагоддзяў чалавечай гісторыі, пасля мора людской крыві і слёз чалавецтва ўсё не навучылася згодзе і тае справядлівасці. Яшчэ ў нядаўнія часы здавалася, што прынцыпы згоды знойдзены на асновах класавасці і сацыяльнасці. На краявідзе замаячыў зваблівы прывід сацыялізме, які спакусіў многіх. Але амаль стогадовы вопыт урэшце ацверазіў чалавецтва: аказалася, што сацыялізм не можа не толькі ашчаслівіць людзей, але і элементарна іх

накарміць. Ён можа хіба спарадзіць таталітарызм і новую, яшчэ больш дасканалую форму заняволення.

Тут, мне здаецца, варта звярнуцца да банальных ісцін. Ад алгебры дзяржаўных адносін да простай арыфметыкі, улічыць вопыт здаровага сэнсу. А ён сведчыць: добрыя людзі найбольш згодна жывуць на прынцыпах крэўнасці: сваёй сям'ёй, сваім племем, сваёй нацыяй. Вядома, не ідэальна, не райскім чынам, затое аптымальна. Мабыць, найлепей з усяго магчымага. Там, дзе гэта даўно зразумелі, там ужо і лад, і згода. І яшчэ дабрабыт. Незалежна ад памеру нацыі, ад яе рэлігіі. Ад яе здольнасцей ці дадзеных Богам прыродных рэсурсаў. Датчане, напрыклад, наўрад ці разумнейшыя за літоўцаў, а фіны за нас, беларусаў. Але ў іх няма картак-візітак і няма тых праблем, якія ў нас выклікаюць жах. Нават такая надзвычайная па сваім лёсе нацыя, як яўрэйская, добра навучаная сваім горкім вопытам, зрабіла адназначную выснову і згортвае сваю дыяспару. Толькі нам, беларусам, Бог ці гісторыя ўпарта не даюць таго, што мы заслугоўваем. Ці, можа, таму, што мы самі не хочам — не можам узяць.

Мы не нацыяналісты, І нам зусім не ўласціва адчуванне нейкай свае вышэйшасці над іншымі. Хутчэй наадварот. Мы ўсё жыццё былі прыдушаны комплексам нашае непаўнацэннасці. Напэўна ж, шмат якія нацыі лепшыя за нас і варты большага. Але ўсё ж нечага варты і мы таксама. Хоць бы за сваё доўгацярпенне. За свае бясконцыя ў вяках пакуты. За сваю спрадвечную немату. І за сваю шматгадовую падлегласць сатанінскаму злу і гвалту.

Дык ці не пара згуртавацца цясней і да чагосьці памкнуцца. Нават калі і не шмат даб'ёмся, дык хоць лішні раз пазнаем сябе як нацыя, адчуем зваблівы покліч справядлівасці, паразумнеем на векавечны розум продкаў, лепшых ахвярнікаў мінуўшчыны. А таксама нашых цяперашніх апосталаў дабра і справядлівасці.

Відаць, у гэтую пару разгойсанасці і сляпых блуканняў будзе шмат знаходак і страт. Можа, тое і заканамерна. Але я жадаў бы напомніць: не трэба пагарджаць тым, што ўжо знойдзена. Што здабыта нашым грамадскім авангардам, абгрунтавана і абаронена ў жорсткіх паядынках са злом. Сярод таго перш за ўсё маю на ўвазе наш палітычны авангард, наш БНФ «Адраджэнне». «Бацькаўшчына» павінна ўпэўнена стаць пад наш і яго агульнанацыянальны, спакутаваны, збэшчаны і святы бел-чырвона-белы беларускі сцяг.

Іншага сцяга ў нас няма і не можа быць.

Жыве «Бацькаўшчына», жыве Беларусь!

ГАЗЕТА «КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА»

Апрель 1991 г.

Мы все провалились в яму, из которой неизвестно как выбраться. Обычно в таких случаях первой следует реакция: кто виноват, кто завел в эту яму? Естественно, что более всех в том повинные клянутся в своей невиновности и указывают на других. Как в этой ситуации должно реагировать общество? Заняться виновными или сообща искать выход из катастрофы?

Разумнее было бы искать выход, чтобы «сообща выбраться из постигшей нас беды». Но все дело в том, что истинные виновники катастрофы, упорствуя в собственном выборе, продолжают указывать ложный выход — в глубину ямы, где, по их мнению, следует копать усерднее и глубже. «Давай-давай!» — с неизменным результатом десятками лет раздается над российскими (и не только) просторами. Крикуны заняты своим профессиональным делом, но что делать остальным? Устранить упрямцев? Но ведь у нас — плюрализм мнений. Последовать их в этот раз «верным указаниям»? Или, игнорируя их, начать поиски в новом направлении?

Очевидно, прежде всего следует успокоиться, прийти в себя, чтобы трезвым взглядом оценить обстановку. Хотя бы определить глубину ямы, в которую угодили. Но как только становится чуть тише и спокойнее, раздаются привычные руководящие голоса, демонстрирующие традиционную нетерпимость. Снова обнаруживается, что наша яма окружена коварными, жаждущими нашей погибели врагами, что следует всеми силами крепить оборону любимой ямы, решительно искоренять в ней «деструктивные силы». Но для чего? По логике этих людей, получается, для того, чтобы выбраться из ямы. На деле же выходит, чтобы спокойно прозябать в ней, занимаясь любимым национальным хобби — классовым, национальным, идеологическим самоедством. Опыт новейшей истории убедительно свидетельствует, что на ничто иное мы и не способны. И все самое-самое из всех областей человеческой деятельности мы можем обратить только для упомянутых целей. Другие цели нас просто не интересуют. Это чуждые для нас цели.

Так, может, в конце концов, хотя бы в яме мы осознаем, кто мы есть на деле?

И первыми сделают это писатели?

А за осознанием последуют выводы. Первым из них должно явиться обращение к терпимости как непременному условию робкого шага к выживанию. Все остальное после.

ПРЕДИСЛОВИЕ К КНИГЕ ЛАРИСЫ ГЕНИУШ «ИСПОВЕДЬ». ИЗДАТЕЛЬСТВО «ДРУЖБА НАРОДОВ»

1991 г.

Более жестокой и несправедливой судьбы, чем та, которая была уготована Ларисе Гениуш, трудно себе и представить. За свою не очень продолжительную жизнь эта женщина изведала все: длительное мытарство на чужбине, нищенское существование на родине, тюрьмы и лагеря, глухую стену непризнания и подозрительности уже в наше, послесталинское, время. И за что? В чем была ее божеская и человеческая вина, лишившая ее общественного положения, достойного ее таланта, ее гражданской честности, ее человеческого достоинства, наконец?

Ныне можно со всей определенностью сказать, что не было за ней решительно никакой вины.

Если, конечно, не считать виной ее неизбывную любовь к родной стороне и ее трудовому народу, его многовековой культуре, низведенной сталинизмом до уровня лагерного обслуживания, к древнему его языку, над которым далеко не сегодня нависла реальная угроза исчезновения. Но сегодня мы имеем возможность хотя бы говорить о том, побуждать общественность к действию, дабы не дать ему вовсе исчезнуть. А что могла молодая белорусская женщина, в канун большой войны очутившаяся на чужой земле, в узком кругу эмигрантов, земляков, студентов,— таких же, как и она, страдальцев, изнывавших в тоске по утраченной родине? Естественно, что она попыталась писать, сочинять стихи на языке своих предков. Начались публикации в белорусских эмигрантских журналах, недюжинный ее талант был замечен. И, наверное, все в ее судьбе сложилось бы более-менее благополучно, если бы не война...

Мы теперь много и правильно говорим о последствиях прошлой войны в жизни нашего народа, о нашей героической борьбе с немецким фашизмом, на которую встал весь советский народ. Но много ли мы знаем о том, в каком положении оказались наши земляки, по разным причинам очутившиеся на той стороне фронта, в различных странах оккупированной Европы. По ряду причин большинство из них не принимало сталинского большевизма на их

родине, но не могло принять оно и гитлеризм. Оказавшись между молотом и наковальней, эти люди были подвергнуты труднейшим испытаниям, некоторые из них этих испытаний не выдержали. После войны положение эмигрантов усугубилось еще и тем, что вина некоторых была распространена на всех, за некоторых ответили все. В первые же годы после победы они значительно пополнили опустевшие за войну бесчисленные лагпункты знаменитого Гулага. Началось новое испытание новыми средствами, среди которых голод, холод, непосильные работы были, может быть, не самыми худшими. Худшим, несомненно, было лишение человеческой сущности и в итоге полное расчеловечение, физическое и моральное.

Лариса Гениуш выдержала все, пройдя все круги фашистско-большевистского ада. Настрадалась «под самую завязку», но ни в чем не уступила палачам. Что ей дало для этого силу, видно из ее воспоминаний — это все то, чем жив человек, что для каждого должно быть дороже жизни. Это — любовь к родине, верность христианским истинам, высокое чувство человеческого достоинства. И еще для Ларисы Гениуш много значила ее поэзия. В отличие от порабощенной, полуголодной, задавленной плоти ее дух свободно витал во времени и пространстве, будучи неподвластным ни фашистским гаулейтерам, ни сталинскому наркому Цанаве, ни всей их охранительно-лагерной своре. Стихи в лагерях она сочиняла украдкой, выучивала их наизусть, делясь только с самыми близкими. Иногда, впрочем, их передавали другим — даже в соседние мужские лагеря, где изнеможженные узники нуждались в «духовных витаминах» не меньше, чем в хлебе насущном. Надежд публиковаться даже в отдаленном будущем решительно никаких не предвиделось, да и стихи эти не предназначались для печати. Они были криком души, проклятием и молитвой.

Последние годы своей трудной жизни Лариса Антоновна провела в низкой старой избушке под высокими деревьями в Зельве, существовала на содержание мужа. Добрейший и интеллигентнейший доктор Гениуш, выпускник Карлова университета в Праге, до самой кончины работал дерматологом в районной больнице. Лариса Антоновна растила цветы и писала стихи, которые по-прежнему нигде не печатались. Жили бедно, пенсии им не полагалось, так как Гениуши числились людьми без гражданства. Зато каждый их шаг находился под неусыпным присмотром штатных и вольнонаемных стукачей, районного актива и литературоведов в штатском. Всякие личные контакты с внешним миром решительно пресекались, переписка перлюстрировалась. Воспоминания свои Лариса Антоновна писала тайком, тщательно хоронясь от стороннего взгляда. Хуже было

с перепечаткой — стук машинки невозможно было утаить от соседей. Написанное и перепечатанное по частям передавала в разные руки с надеждой, что что-нибудь уцелеет, сохранится для будущего.

И вот теперь «Исповедь» публикуется.

Из этих созданных человеческим умом и страстью страниц читатель узнает об еще одной трудной жизни, проследит еще один путь в литературу и к человеческому достоинству. Что касается Ларисы Гениуш, то у нее эти два пути слились в один, по существу, это был путь на Голгофу. Все пережитое на этом пути способствовало кристаллизации поэтического дара Ларисы Гениуш, к которому мы приобщаемся только теперь. Белорусские литературные журналы печатают большие подборки ее стихов, сборники их выходят в наших издательствах. И мы вынуждены констатировать, что талант такой пронзительной силы едва не прошел мимо благосклонного внимания современного читателя. Хотя разве он первый. Литературы всех наших народов открывают ныне новые произведения некогда известных авторов, а также личности самих авторов — погибших в лагерях, расстрелянных в тюрьмах, казалось, навсегда изъятых из культурного обихода народов. Но вот они воскресают, хотя с опозданием, доходят до человеческого сознания. И среди них волнующая «Исповедь» замечательной белорусской поэтессы Ларисы Гениуш.

ВЫСТУПЛЕНИЕ НА МЕЖДУНАРОДНОЙ КОНФЕРЕНЦИИ «ПРАВА НАЦИЙ, ПРАВА ЧЕЛОВЕКА»

Май 1991 г.

Процессы, происходящие ныне в нашей многострадальной стране, характеризуются немалой сложностью и запутанностью. Развиваясь в каждом регионе по-своему, они тем не менее имеют довольно общее происхождение, очевидную основу которого представляет преодоление тоталитаризма, последствий порабощения человека властью, давнего и всестороннего подавления его прав. Надо заметить, что независимо от того, ставилось ли это подавление в качестве советского социалистического идеала или получилось по ходу, само собой, именно в этой области наша коммунистическая система достигла наиболее полной победы. За 70 лет господства этой системы человек не только был поставлен на колени, не только была подавлена его воля к какому-либо сопротивлению, но и была создана позорная культура «существования на коленях», от которой мы во многих случаях не торопимся избавиться и поныне. Мы все еще во власти ее

иллюзий. Не из нее ли происходят многие несостоятельные тенденции наших дней — от призывов к иллюзорному плюрализму, диалогам с недавними надсмотрщиками, переставшими по команде щелкать кнутами, до безуспешных попыток организации круглых столов с ними, на которых, все распри позабыв, можно о чем-то договориться. Увы! Практика показывает, что раб и господин не могут договориться ни о чем ином, кроме как о новом рабстве и новом господстве. За стол переговоров могут сесть лишь свободные люди, равноправные партнеры, объединенные поисками способов согласия, а не возможностей удержания ускользающей власти. Я не ястреб, я демократ, и я не понимаю, о чем молено договориться с людьми, которые еще вчера отдавали каннибальские приказы о применении газов против собственных граждан, организовывали кровавые бани возле зданий парламента, по трупам штурмовали танками национальное телевидение, а сегодня устраивают кровавые стычки на границах суверенных республик, несомненно с целью расширения так полюбившегося им карабахского опыта. Под предлогом защиты интересов национальных меньшинств они грубо попирают исконные интересы целых больших наций, вся вина которых состоит лишь в том, что те наконец проявили политическую волю к свободе и самоопределению. В такой ситуации диалог с ними будет безрезультатен, сколько бы он ни велся, и послужит лишь маскировке истинных целей «большой силы», придания ей демократического благообразия. Надо отчетливо видеть, что о плюрализме, диалоге и терпимости к инакомыслию первыми заговорили те, кто еще вчера не признавал никакого плюрализма и никакой терпимости, чья политика целиком основывалась на классовой непримиримости, а единственным приемлемым способом общения с инакомыслящими были колонии усиленного режима и психушки. За годы перестройки в этой области изменилось не многое. Как известно, эта система вообще лишена способности к переменам и саморазвитию, это изначально закостенелая система. Со временем меняются лишь пропагандистские клише да символы, обозначающие ее сущность. «Контрреволюционер», «враг народа», «идеологический диверсант» — ЧК, ГПУ, НКВД, ВКП(б), МГБ, КПСС, КГБ, «спецназ», «омон» — вот этапы этих «кардинальных» изменений за 70 с лишним лет ее владычества.

Весьма свободно обходясь с нормами человеческой нравственности и морали, система свободна в выборе собственных политических и особенно полицейских средств, бесконечно изобретая их в указах, уголовных кодексах, постановлениях и законах. Нередко случается, что положения, совершенно недопустимые в демократическом

обществе, у нас вполне допустимы и даже обретают силу закона. Это мы лукавим, когда репрессии 30-х годов квалифицируем как акты беззакония — все и тогда делалось по законам. Только по бесчеловечным законам, в этом все дело. В различных обществах законы могут быть разные, но антидемократические законы могут появиться только в антидемократических обществах. В таких же обществах возможно самое вольное обращение и с демократическими законами. Недавно обнаружилось, что Декларация Копенгагенской конференции прошлого года, подписанная в числе прочих и советскими представителями, переведена на русский язык таким удобным образом, что дает возможность использовать ее против смысла, а именно против требований о департизации государственных структур. Другое положение этой декларации — об обязательности альтернативности воинской службы — просто игнорируется путем замалчивания. Генерал Макашов не приемлет никакой иной армии, кроме той, которой научился командовать, и общество бессильно против него. Так же, как бессильно против бесчинств «омона» на литовских границах. Лукавое, однако, бессилие, возможное лишь в государстве, где и права человека, и права наций — не более чем пропагандистская фигура, фиговый листок на могучем теле матерого тоталитаризма.

Впрочем, на эту тему можно говорить долго и много, и, я надеюсь, такой разговор состоится. И о святом, божеском праве наций на самоопределение, и о неотъемлемом праве каждого рожденного под солнцем не только на жизнь, но и на свободу. И о праве гражданина полностью реализовать его, Богом данные ему способности в самых благоприятных условиях, предоставленных и организуемых для него государством. Конечно, каждое государство — определенная система регламентаций и ограничений, но вовсе не карцер с решеткой и намордником, в который оно давно превратилось у нас. В идеале это скорее лаборатория, мастерская для разумной жизнедеятельности гражданина. В противном случае зачем ему государство? Суверенитет нации — не порочная идеология университетских профессоров и не преступное политиканство «деструктивных сил», как это некоторым кажется, а единственно возможная форма выживания наций в современных разрушительных условиях. Теперь уже ясно, что без полного суверенитета ни одна нация с ослабленным (в условиях долголетнего имперского существования) менталитетом сохраниться не сможет. Поэтому — полный суверенитет для тех наций, которые для него созрели, полная демократизация общественных отношений и полное устранение из жизни общества коммунистической идеологии и морали как средств тупикового варианта общественного развития. В

этом категорический императив нашего времени, если мы всерьез озабочены намерением вернуться в семью цивилизованных народов Европы и мира.

ВЫСТУПЛЕННЕ НА КАНГРЭСЕ БЕЛАРУСІСТАЎ

Май 1991 г.

Беларусы — мабыць, адна з самых няшчасных нацый Еўропы. Не зважаючы на ўсе нашы зусім неблагія, Богам дадзеныя чалавечыя якасці, мы дагэтуль не маем таго, чаго варта мець кожная нацыя свету, для чаго, па сутнасці, яна і існуе пад небам. І ўсё таму, што з нейкага капрызу гісторыі мы ўпусцілі свой нацыянальны цягнік і апынуліся ў ролі вечных паязджан, пазбаўленых прыстойнага лёсу, здатнага прытулку дзяржаўнасці. Можа, толькі цяпер гісторыя дае нам пэўны і надта сумніцельны шанец, і ўсё залежыць ад таго, ці пакарыстаемся мы ім. Ці ён у каторы раз выслізне з нашых няўмелых рук. Асабліва калі ёсць надта спрытныя рукі, якія б'юць спрактыкавана, пад дых.

Зноў, як і заўжды, найбольшыя спадзяванні на нашу мову, гэты галоўны нацыянальны набытак, наша гістарычнае апірышча. Нездарма яе так вынішчалі ў стагоддзях — забаранялі, аплёўвалі, адвучвалі ад яе цэлыя пакаленні — у імперыі патрэбна была адна, унітарная мова. Але калі мы, нацыянальна панішчаныя, класава раз'яднаныя, спаскуджаныя шматгадовай маной, нешта ўсё ж значым у сусветнай суполцы народаў, дык найперш праз гэтую нашу мову. Без яе ад нас не засталося б і следу, як не засталося яго ад колішніх тутэйшых ятвягаў. Мова верна служыла народу ў добры і благі час, ратавала яго існаванне і ніколі не здраджвала яму. Гэта ёй нярэдка і няўдзячна здраджвалі на Беларусі, за што заўжды былі бязлітасна караны Богам і гісторыяй.

На гэтай мове праз пэўную долю маны і пустаслоўя створаны, аднак, самы светлы і высакародны фальклор, напісана немалая літаратура. І сёння я рады вітаць у гэтай зале нашых братоў у выгнанні, а таксама нашых знакамітых паслоў, паўнамоцных прадстаўнікоў беларушчыны ў розных краінах свету. Гэта іх намаганнямі народы пазналі Беларусь і беларусаў — высакароднасць нашага сэрца, наш бясхітрасны розум і наш неспатольны боль. Так, боль. Менавіта боль — гэты наш гістарычны спадарожнік, які ні на год не пакідаў нас у мінулым, не пакідае і зараз. У нашай імперыі даўно ўжо няма шчаслівых народаў, але беларусы, як ужо сказана, можа, самыя

нешчаслівыя сярод іх. Бо, не зважаючы на гаманкую імітацыю рэфармізму, на Беларусі нічога не мяняецца, па-ранейшаму кашай афіцыйнай рэлігіяй застаецца сацыялістычная дэмагогія, наш парламент — не болей чым гаманкая сходка камуністаў, занепакоеных адзінай праблемай — утрыманнем улады. У нас беззваротна панішчана сялянства, гэты традыцыйны асяродак беларускасці, наш рабочы клас робіць толькі першыя няўмелыя спробы ўстаць з каленяў, а наша нацыянальная інтэлігенцыя ў масе сваёй — тыповае ўвасабленне лакейскага канфармізму. Менавіта ў гэткіх варунках беларускі народ наблізіўся да краху нацыянальнай культуры і дзяржаўнай эканомікі, наперадзе нас чакае татальны заняпад і голад з усімі яго жахлівымі наступствамі. Перспектыва выжывання нацыі, густа засыпанай радыенуклідамі, абсалютна няпэўная, калі не зусім змрочная. У гэткіх варунках ашчаднікамі нашай нацыянальнай існасці можа стаць беларуская дыяспара, выгнанне, дзе высілкамі беларускіх патрыётаў можа захавацца наш нацыянальна-культурны генафонд. У нас, на Беларусі, тое ўжо немагчыма, тое панішчыцца калі не пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, якая не паспела гэтага зрабіць у свой час, дык ва ўмовах рыначнай эканомікі. Гістарычны вопыт паказвае, што зберагчы сябе ды сваю існасць нацыя здольна толькі ва ўмовах абсалютнага суверэнітэту. Дзяржаўны суверэнітэт, поўная культурная самастойнасць і палітычная незалежнасць — не заганная ідэалогія і не сепаратысцкае палітыканства, як гэта сцвярджаюць шавіністы-дзяржаўнікі. Гэта адзіна магчымая форма нацыянальнага выжывання ў сучасных, савецкіх умовах. Без поўнай палітычнай незалежнасці нацыя з такім аслабленым у нацыянальных адносінах менталітэтам выжыць не можа. Успомнім мудры запавет мужнага Яські з-пад шыбеніцы, у ім уся справа. Таму зусім наіўнымі, калі не яўна спекулятыўнымі, з'яўляюцца намеры тых нашых псеўдапатрыётаў, якія цешаць сябе ілюзіямі дамагчыся захавання на беларушчыне метаду прыручэння да яе «правільнай», «нескажонай» камуністычнасці, бальшавізму з «ласкавым» тварам. Які ў бальшавізму твар, чалавецтва добра ўжо ўведала, і нідзе той твар не меняецца. Ён нязменны.

Так, спадзяванак у нас няшмат, і можа, апошняя наша надзея на несмяротную сутнасць народа. Усё ж дзеля чагосьці ён быў створаны Богам на гэтай благаславеннай зямлі. І мы цешым сябе думкаю, што Беларусь яшчэ неяк паслужыць на ёй, калі не нам, дык наступным пакаленням, а можа, і сусветнай цывілізацыі. У гэтым сэнсе мы і вызначаем наш абавязак і бачым нашу святую надзею,

якія мы і ажыццяўляем, наколькі тое нам дадзена бязлітасным лёсам і не меней жорсткай гісторыяй.

ГУТАРКА З КРЫТЫКАМ ВАНКАРЭМАМ НІКІФАРОВІЧАМ

1991 г.

Ванкарэм Нікіфаровіч. Васіль Уладзіміравіч, здарылася так, што нашу гаворку пра сённяшні стан і шляхі далейшага развіцця беларускай нацыянальнай культуры мы вядзём адразу пасля параўнальна добра арганізаваных на вашай радзіме, на Віцебшчыне, першых усесаюзных дзён, прысвечаных жыццю і творчасці вашага выдатнага земляка, славутага мастака Марка Шагала. Ці не сімвалічна гэта? Бо мы, калі можна так сказаць, неўзабаве пераступім парог новага, дваццаць першага стагоддзя. Што з духоўных здабыткаў пяройдзе туды, што чалавецтва возьме з сабой? Такое пытанне, натуральна, не можа не цікавіць усіх дзеячаў культуры. Мне здаецца, што Марк Шагал — менавіта той мастак, які сваім жыццём і сваёй творчасцю, той культурна-сацыяльнай аурай, якая складалася і будзе складвацца вакол яго, якраз вызначае сутнасць нашага, дваццатага стагоддзя, яго, так бы мовіць, аблічча.

Васіль Быкаў. Будучы на Шагалаўскіх днях у Віцебску, я думаў вось пра якую з'яву. Час — гэта бязлітасны фактар у нашым жыцці, дый наогул у гісторыі. Час робіць вялікі адбор з таго, што існуе ў мастацтве. Дык вось, я думаю, што з усяго нашага мастацтва, не сказаць — беднага, хутчэй наадварот — развітога і багатага, час адбярэ для будучыні вельмі нямногія імёны. Але ў ліку іх абавязкова ў наступнае стагоддзе пяройдзе імя Марка Шагала. Таму што ён — эпахальны мастак, якому будучыня належыць гэтак жа непадзельна, як і мінулае. Не часта так здараецца ў мастацтве, што прызнаны пры жыцці мастак карыстаецца такім жа прызнаннем і ў будучым. Часта бывае наадварот. Мы ведаем з гісторыі мастацтва мноства прыкладаў, калі вялікае прызнанне прыходзіла да мастака толькі пасля яго смерці. І вельмі рэдкія выпадкі, як з Маркам Шагалам. Ён быў прызнаны пры жыцці, увесь свет пакланяўся перад яго талентам. Гэта, канечне, шчаслівы лёс. Хіба што гэты лёс мае прыкрае выключэнне на яго радзіме, дзе М. Шагал даволі доўгі час, прынамсі пры яго зямным жыцці, быў не толькі не прызнаны, проста яго не ведалі нашы людзі. Хоць гэта і вельмі дзіўная з'ява. Ну, але што рабіць, наш час багаты на такія дзіўныя з'явы. Марка Шагала не прызнавалі на Беларусі, не прызнавалі ў Віцебску, ды і ўвогуле не

прызнавалі яго ў нашай магутнай дзяржаве. Таму было многа прычын. А галоўная з іх — гэта наш дзяржаўны таталітарызм, наша, так бы мовіць, вузкая, недарэчная ідэалагізацыя ўсёй культуры. Будзем спадзявацца, аднак, што ўсё гэта мінула. Марк Шагал навечна прапісаны ў Беларусі, у Віцебску, і яго слава будзе расці так, як яна таго заслугоўвае.

В. Н. Будзем спадзявацца, што так і будзе, што сапраўды ў нас сёння змяніліся адносіны многіх кіраўнікоў і чыноўнікаў культуры да Шагала, да яго творчасці. Тым не меней, мне здаецца, што праблема вяртання спадчыны, праблема сённяшняга выкарыстання тых духоўных здабыткаў, якія ствараліся і ствараюцца на гэтай зямлі, стаіць перад намі вельмі востра і актуальна. Калі мы звернемся да нашай беларускай культуры, беларускай літаратуры, мы павінны нагадаць, што толькі зусім нядаўна мы пачалі на ўвесь голас называць імя выдатнага паэта Алеся Гаруна. Мы пачалі знаёміцца з творамі, напрыклад, яшчэ аднаго найцікавейшага пісьменніка, драматурга Францішка Аляхновіча. Але знаёмства чытачоў з ім чамусьці пачалося з яго лагерных запісах, зразумела, з запісаў вельмі хвалюючых, але Францішак Аляхновіч — гэта перш за ўсё драматург, аўтар вельмі многіх цікавых п'ес. Ёсць яшчэ некалькі імёнаў, якіх не ведаюць сённяшнія і чытачы і гледачы. І трэба абавязкова вярнуць іх у наш культурны кантэкст.

В. Б. Гэта было б справядліва. У мінулым шмат што з нашага мастацтва, літаратуры было выключана з нашага жыцця. Вядомы прычыны, чаму так адбылося. І цяпер, калі час змяніўся, натуральна, тое трэба паправіць хаця б у імя элементарнай справядлівасці. Аднаўленне культурнага асяродка паступова адбываецца сёння на фоне палітычнай рэабілітацыі. Змяніўся палітычны клімат у краіне, з'явілася магчымасць для таго, каб прагледзець многія справы з пакараннем, са знішчэннем многіх грамадзян нашай краіны, у тым ліку і дзеячаў культуры. Таму працэс гэты натуральны. Аднак ідзе ён вельмі запаволена. І зусім не таму, што тут патрэбны нейкія разбірацельствы. Усё даўным-даўно вядома. Што датычыць некаторых імёнаў і тых, якія вы назвалі, дык пісьменнікі даўно ўжо хадайнічалі за іх перад уладай. Адразу пасля ХХ з'езда КПСС мы прасілі рэабілітаваць жыццё і творчасць такога найвыдатнейшага паэта, як Алесь Гарун. Але для таго каб сапраўды яго рэабілітаваць і ўвесці ў літаратурны ўжытак, спатрэбілася чвэрць стагоддзя. Канечне, рэакцыйныя сілы ўсяляк гэтаму перашкаджалі. Перашкаджаюць яны, дарэчы, і цяпер. Варта толькі паглядзець некаторыя беларускія выданні апошняга часу, нават апошніх месяцаў, каб зразумець, што

пасля некаторай перадышкі тыя сілы зноў узнімаюць галаву, робяць спробы абвінаваціць нават тых, каго па два разы ўжо рэабілітавалі. Гэта вельмі дзіўная справа.

Першая рэабілітацыя, якая адбылася недзе ў канцы 50-ых, аказваецца, патрабавала яшчэ і паўторнай рэабілітацыі: усё яшчэ знаходзяцца людзі — «вучоныя» і «публіцысты», якія настойваюць на тым, што асуджаныя былі ў чымсць вінаватыя. І калі, напрыклад, якога-небудзь расстралянага пісьменніка ці вучонага рэабілітуе Вярхоўны суд рэспублікі, дык яны кажуць, што гэта ён рэабілітаваны ў крымінальным парадку, а творчасць яго ідэалагічна не рэабілітавана і знаходзіцца, як і раней, пад арыштам. Такое адбываецца, напрыклад, з Францішкам Аляхновічам і з некаторымі іншымі. І ў гэтым сэнсе работы, канечне, яшчэ вельмі многа. Я думаю, што патрэбны намаганні ўсёй грамадскасці, каб была паспяхова вырашана гэтая праблема.

В. Н. Вы маеце на ўвазе публікацыі ў «Политическом собеседнике», у адным з апошніх нумароў?

В. Б. Гэты часопіс вызначаецца такой рэакцыйнасцю, якую зараз проста цяжка сабе ўявіць. Я думаю, што на Захадзе проста не паверацъ, што ў час перабудовы і дэмакратызацыі ў Беларусі магчымы такія выданні.

В. Н. Але давайце ўсё ж вернемся да праблемы нашай спадчыны і да яе гучання сёння. Цікава было б пачуць вашу думку па такой вось праблеме. У публікацыях нашых некаторых крытыкаў, пераважна маладых, апошнім часам з'яўляецца, я б сказаў, нейкі іншы накірунак, назавём яго крайнасцю. Яны, вядома, максімалісты, яны прыйшлі ў жыццё, у літаратуру на хвалі нашага сённяшняга новага адраджэння мовы, культуры, гістарычнай спадчыны, у іх вялікая цікавасць да гісторыі, да ўсяго, што было ў нас. І гэта зразумела. Але яны часам кажуць: «Паглядзіце, што гэта такое — наша беларуская культура, беларуская літаратура? Ці ёсць сапраўды нешта ў ёй вартае, каштоўнае, тое, што сёння можа нас жывіць, сілкаваць, чым мы можам сапраўды ганарыцца? Ці не прыдумалі мы ўсё гэта?» Тым больш што мы сёння сапраўды пераглядаем многія ацэнкі, многія аспекты. Мы ведаем, што наша літаратуразнаўства і наша крытыка на працягу многіх дзесяцігоддзяў былі вульгарна-сацыялагічнымі, эстэтычны аналіз знік з нашых даследаванняў, артыкулаў, манаграфій. Гэта пытанне я чую ў галасах маладых: ці ёсць у нас што? Ці ёсць такая беларушчына і той духоўны мацярык, за якія трэба змагацца? А можа, усё трэба стварацъ нанова? Да таго ж, скажам, многія маладыя, у прыватнасці крытык Сяргей Дубавец,

ставяць пытанне так: гаварыць сёння пра аднаўленне мовы, нацыі, культуры немагчыма, скажам, без вырашэння такіх праблем, як Вільня, Віленшчына. Нібыта без Вільні, без Віленшчыны і няма беларушчыны. Мне здаецца, што ўсё гэта не зусім так, што патрэбны нейкі больш далікатны, больш дакладны падыход.

В. Б. Канечне, гэта праўда. Але я сказаў бы, што пэўны рыгарызм некаторых маладых прадстаўнікоў культуры і крытыкаў увогуле можна зразумець. Гэта адпаведная рэакцыя на нашу ранейшую палітыку. На ранейшы стан нашай культуры і праблемы культуралогіі. Канечне, ёсць пэўны сэнс у тым, што гаворыць той жа Дубавец. Хаця, безумоўна, важна яшчэ таксама, як гаварыць, у якім кантэксце і ў які час. Нельга забываць, што мы жывём у надзвычайнай палітычнай атмасферы, а калі браць сучаснасць, дык нават ва ўмовах празмернай палітызацыі ўсёй грамадскасці. І, безумоўна, ад тых, што выказваюць нейкія меркаванні ў гэтай галіне, патрабуецца асцярожнасць і абсалютная дакладнасць. Асабліва калі гаворка ідзе пра міжнацыянальныя адносіны. Канечне, гаворка пра Вільню павінна быць вельмі асцярожнай. Нават у тым выпадку, калі да яе ёсць пэўная падстава, імкненне да нейкай справядлівасці. Я б сказаў, што галоўная праблема не ў тым, што кажуць маладыя крытыкі, а ў той нашай палітычнай атмасферы, якая панавала многа гадоў у даперабудовачны перыяд. У тыя гады стваралася новая культура, адметная ад ранейшай. І, як цяпер аказалася, гэтая культура наогул не мела нічога агульнага з сапраўднай нацыянальнай культурай. Гэта была псеўдакультура. І вось мы маем сёння такую сітуацыю, калі некалькі пакаленняў прайшлі міма сапраўднае культуры. Многія пакаленні розных пластоў грамадства — і рабочага класа, і інтэлігенцыі, і сялянства — па сутнасці выраслі ў атмасферы поўнага бескультур'я. Гэта не значыць, што яны пэўным чынам не былі адукаваныя ці засталіся людзьмі нявыхаванымі. Іх старанна выхоўвалі і адукоўвалі, але сёння асабліва відно, што гэта была за адукацыя і што за выхаванне. Ацэнкі многіх культурных з'яў мінулага былі скажоныя, сапраўдныя каштоўнасці нацыянальнай культуры засталіся нам невядомыя. Я ўжо не кажу пра вялізны «забыты» пласт рэлігійнай хрысціянскай культуры на Беларусі. Амаль палова здабыткаў беларускай літаратуры мінулага была як бы вынесена за дужкі нацыянальнай культуры. Многія выдатныя культурныя дзеячы мінулага былі падвергнуты астракізму. На прыкладзе з Шагалам ці з тым жа Гаруном можна ў тым пераканацца. Адсюль можна зразумець, што засталося ад нашай нацыянальнай культуры, на чым маглі выхоўвацца пакаленні. І хоць такія імёны, як Скарына, Кастусь

Каліноўскі, ды і іншыя імёны дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэння, і былі вядомыя, іх нават вывучалі ў школе, ды ацэнка ім давалася абсалютна неадэкватная сапраўднаму іх значэнню. Можна зразумець, які быў характар той культуры, якой валодалі масы на працягу дзвюх трацей стагоддзя. А тое ж было не так ужо і даўно. Дастаткова ўспомніць Уладзіміра Караткевіча, найвыдатнейшага нашага пісьменніка, мастака нашай сучаснасці. Ён толькі цяпер, пасля смерці, пачынае набываць вартую яму адэкватную ацэнку ў нашай культуры. А раней, калі ён жыў і ствараў свае цудоўныя творы, сустракаў або адкрытае, або завуаліраванае процідзеянне з боку літаратурнай крытыкі, культурнага і партыйнага кіраўніцтва. І ўсё тое выдатнае, што ён напісаў, стварыў, зроблена не з дапамогай, а пераадольваючы вялізнае супраціўленне начальства.

В. Н. Калі гаворка зайшла пра Уладзіміра Караткевіча, я магу многае прыгадаць... У канцы пяцідзесятых —пачатку шасцідзесятых я якраз працаваў у выдавецтве. Тады гэта было адно толькі ў рэспубліцы выдавецтва. Яно называлася «Дзяржаўнае выдавецтва БССР». Я помню, як перакідваўся з плана ў план яго раман «Каласы пад сярпом тваім», пакуль ён з такім спазненнем прыйшоў да чытачоў. Адзін з лепшых твораў Уладзіміра Караткевіча — раман «Леаніды не вернуцца да зямлі» (так ён называўся спачатку, цяпер ён вядомы як раман «Нельга забыць») быў ужо набраны, была другая карэктура. І як мы ні супраціўляліся ў выдавецтве, але па загаду начальства набор быў рассыпаны. Можна нагадаць не толькі імёны, але і творы, якія былі доўгі час забаронены, творы вядомых нашых пісьменнікаў, нават класікаў. Янка Купала, наш нацыянальны геній, напісаў у 1922 годзе п'есу «Тутэйшыя», найвыдатнейшую п'есу, якая столькі гадоў праляжала, яе забаранялі ставіць і друкаваць. Вельмі мала, на жаль, захавалася звестак пра тое, як у 1926 годзе тэатр, які сёння носіць імя Янкі Купалы, падрыхтаваў прэм'еру гэтага спектакля, але на генеральную рэпетыцыю, яшчэ тады, заўважце — у 1926 годзе, прыйшло начальства і катэгарычна забараніла паказваць спектакль. І з таго часу п'еса ляжала пад забаронай. Была адна спроба: рэжысёр Валерый Маслюк паспрабаваў паставіць яе, аб яднаўшы з «Адвечнай песняй» Я. Купалы, задача была стварыць пераважна этнаграфічны спектакль, але і гэта спроба не знайшла афіцыйнай падтрымкі. І вось толькі ў канцы мінулага года «Тутэйшыя» ўбачылі святло рампы на сцэне тэатра імя Янкі Купалы ў пастаноўцы рэжысёра Мікалая Пінігіна. Мне здаецца, што з нашай духоўнай спадчыны мы павінны перш за ўсё браць і набліжаць тое, што заснавана, грунтуецца на глебе агульначалавечай культуры,

агульначалавечай маралі, якая выпрацоўвалася на працягу стагоддзяў. Яшчэ зусім нядаўна які быў галоўны крытэрый: гэта твор сацрэалізму, значыць, ён добры. У адным з нумароў часопіса «Огонек» змешчаны быў артыкул Аляксандра Генка пра сучасную літаратуру, пра шляхі яе развіцця. Аўтар там так ставіць пытанне: што сёння рабіць пісьменнікам, якія цяпер у іх духоўныя перспектывы? Бо ўсё лепшае, што было створана ў савецкія гады, нават творы такога пісьменніка, як А. Платонаў, было асветлена пэўным ідэалам, ідэалам, скажам так, камуністычным, марксісцкім, вялікім, як мы звыклі казаць. Але сёння многія ідэалы па сутнасці аказаліся іншымі, многія зніклі, размыліся. Пытанняў намнога болей, чым адказаў на іх.

